Новы Час | 30 лістапада 2018 | № 44 (607) | «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | №11

Літаратурная Беларусь

Выпуск №11 (147)
(лістапад)

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»
lit-bel.org
novychas.by

Змест

Бацька і сын Гарэцкія

Да 90-годдзя Радзіма Гарэцкага

Таццяна ЯКУБОЎСКАЯ

7 снежня 2018 года спаўняецца 90 гадоў Радзіму Гаўрылавічу Гарэцкаму — акадэміку, геолагу, грамадскаму дзеячу, пісьменніку, прадстаўніку знакамітага роду Гарэцкіх і Чалавеку, які сваёй шматграннай плённай дзейнасцю ўмацоўвае незалежную Беларусь.

Бацька яго, Гаўрыла Іванавіч Гарэцкі, — адзін з заснавальнікаў Беларускай акадэміі навук, быў абраны акадэмікам у снежні 1928 года, калі ў Менску нарадзіўся яго другі сынок, названы ў гонар правадыра племя радзімічаў, што жылі ў старажытнасці на ўсходзе нашай краіны. Радзім Гаўрылавіч Гарэцкі — аднагодак цяперашняй Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. На сайце акадэміі пра Р. Г. Гарэцкага можна даведацца, што ён вучоны ў галіне геалогіі і геатэктонікі, з'яўляецца замежным членам Расійскай адэміі навук, доктарам геолага-мінералагічных навук, прафесарам, Заслужаным дзеячам навукі, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі СССР і Дзяржаўнай прэміі БССР, а таксама Прэміі НАН Беларусі і Прэміі Расійскай АН, узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі і іншымі адзнакамі.

Але згаданы афіцыйны сайт акадэміі не дае даведкі аб усебаковай дзейнасці нашага знакамітага сучасніка. У навуковай, навукова-арганізацыйнай, грамадскай і асветніцкай працы Радзім Гаўрылавіч прадоўжыў справы бацькі, асноўныя напрамкі якіх дзіўна супадаюць: у абодвух любімая навука геалогія, абодва былі дырэктарамі навуковых інстытутаў, абодва працавалі ў вядучых вышэйшых навучальных установах, сталі выбітнымі спецыялістамі ў прафесійнай дзейнасці, абодва — лідэры Адраджэння, абаронцы незалежнасці і беларускасці роднай краіны.

Навуковыя дасягненні Р. Г. Гарэцкага ў геалогіі — тэктоніцы і геадынаміцы платформаў і радовішчаў карысных выкапняў — добра вядомы ў колах геолагаў не толькі Беларусі, але і Еўропы, і многіх краін свету. Яны адлюстраваны ў сотнях навуковых публікацый, сярод якіх фундаментальныя манаграфіі і тэктанічныя карты, створаныя на падставе тэорыі тэктонікі пліт і адмыслова распрацаванай методыкі картаграфавання структур зямной кары, матэрыялы міжнародных праектаў, даклады на сесіях Міжнароднага геалагічнага кангрэса, Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА і шматлікіх іншых форумаў навукоўцаў свету і розных краін.

Навукова-арганізацыйная праца Радзіма Гаўрылавіча ў якасці дырэктара Інстытута геахіміі і геафізікі НАН Беларусі ў часы яго росквіту (1977–1993 гг.), калі інстытут налічваў 300 супрацоўнікаў, стваральніка, прафесара і загадчыка кафедры дынамічнай геалогіі геаграфічнага факультэта БДУ (ён вярнуў у БДУ геалагічную спецыялізацыю), віцэ-прэзідэнта Акадэміі навук Беларусі, арганізатара і кіраўніка міжнародных навуковых праграм і нарад па тэктоніцы, не могуць не выклікаць захаплення.

Шырока вядомая і няспынная грамадская ды асветніцкая праца Р. Г. Гарэцкага як сябра Рады і Прэзідэнта Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына», сябра Рады многіх грамадскіх аб'яднанняў (Таварыстваў беларускай мовы і Беларускай інтэлігенцыі, Беларускага фонду культуры, прэзідэнта Фонду імя братоў Луцкевічаў, старшыні Фонду братоў Гарэцкіх), натхняльніка і аднаго з арганізатараў штогадовых «Чытанняў братоў Гарэцкіх» і навуковых чытанняў, прысвечаных памяці Г. І. Гарэцкага, аўтара шматлікіх публіцыстычных артыкулаў у газетах і часопісах аб важных падзеях у гісторыі Беларусі і сучасным жыцці. Гэтая дзейнасць Радзіма Гаўрылавіча выяўляе яго шырокую эрудыцыю, гарачую ўвагу да пытанняў нацыянальнага развіцця Бацькаўшчыны, глыбока чалавечае, інтэлігентскае стаўленне да людзей і праблем, якія хвалююць сучаснікаў.

Гаўрыла Іванавіч Гарэцкі, — адзін з заснавальнікаў Беларускай акадэміі навук, быў абраны акадэмікам у снежні 1928 года, калі ў Менску нарадзіўся яго другі сынок, названы ў гонар правадыра племя радзімічаў



Бацька і сын — Гаўрыла і Радзім Гарэцкія ў Інстытуце геахіміі і геафізікі АН БССР, 1978 г.

З 2006 года Радзім Гарэцкі — сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў. Яго знакавыя літаратурныя творы апублікаваныя значна раней гэтай даты. Сярод іх — «Шляхам адраджэння» (1997), «Ахвярую сваім «Я» (1998), «Вечна жыве Беларусь!» (2003) ды інш.

Творчасць пісьменніка Р. Гарэцкага мае трывалыя карані ў родзе Гарэцкіх: яго бабуля Еўфрасіння Міхайлаўна была бардам свайго часу, ад яе запісаны больш за 300 песень, частку якіх сама і стварыла, а дзядзька Максім Гарэцкі стаў прызнаным класікам беларускай літаратуры. Акрамя ўжо названых кніг тэма жыцця і творчасці Максіма і Гаўрылы Гарэцкіх распрацоўваецца Р. Гарэцкім на падставе ўспамінаў родных і сяброў, розных дакументаў і асабліва эпісталярнай спадчыны Гарэцкіх у кнігах «Браты Гарэцкія» (2008), «Акадэмік Гаўрыла Гарэцкі і Украіна» (2009), «Лісты жыцця і кахання» (2013). У гэтых кнігах Радзім Гаўрылавіч прадоўжыў апісваць гісторыю роду Гарэцкіх, якую распачаў Максім Гарэцкі ў сваёй «Камароўскай хроніцы». Дзмітрый Бугаёў адзначыў: «Кніга пра братоў Гарэцкіх напісана з такімі замілаванасцю і сардэчнасцю, што кожны, хто ўважліва прачытае яе, абавязкова адчуе самаадданасць абодвух братоў у працы дзеля Беларусі, іх чалавечае высакародства, вышыню душэўных памкненняў і вялікую таленавітасць у многіх адносінах» (прадмова да кнігі «Браты Гарэцкія»). Вельмі важным момантам у гэтых творах, якія можна аднесці да дакументальна-эпісталярных, з'яўляецца пастаянная прысутнасць самога аўтара, эпізоды яго ўласных успамінаў аб перажытым сям'ёй і ім самім. Па гэтых эпізодах узнаўляецца дзяцінства, сталенне і шлях у навуцы самога Радзіма Гаўрылавіча, яго стаўленне да бурлівых падзей нашага часу, яго чалавечыя, нацыянальныя і грамадзянскія ідэалы.

У кароткі момант даступнасці да архіваў КДБ на пачатку 1990-х гадоў Радзім Гаўрылавіч здолеў адшукаць і прачытаць справы братоў Гарэцкіх і апублікаваць гаротную праўду пра іх лёс. Радзім Гаўрылавіч здзейсніў подзвіг, вывучаючы матэрыялы следства па прысудах любым бацьку і дзядзьку, іх паказанні, пачварныя абвінавачванні і прысуды, асэнсаваў гэтыя страшныя падзеі і напісаў аб іх, перш-наперш, у кнізе, загалоўкам якой была абрана сутнасць жыццёвага крэда Максіма Гарэцкага: «Ахвярую сваім «Я» ва імя святога ўсім нам Адраджэння». Немагчыма чытаць без душэўных пакут гэтыя аповеды і лісты ды ісці ўслед за аўтарам па крыжовай дарозе волатаў духу. А ісці павінны, бо толькі на гэтым шляху мы пазнаём Праўду.

...У 1927 годзе Г. І. Гарэцкага прызначаюць дырэктарам новага Беларускага навукова-даследчага інстытута сельскай і лясной гаспадаркі імя У. І. Леніна. Праз 3,5 гады 24 ліпеня 1930 года яго, ужо акадэміка, арыштоўваюць па справе «Працоўнай сялянскай партыі», якая быццам была арганізавана прафесарамі Пятроўскай (тады Ціміразеўскай) сельскагаспадарчай акадэміі, а таксаме па справе неіснуючага, выдуманнага ў ДПУ «Саюза вызвалення Беларусі».

Р. Гарэцкі доўга вагаўся, ці варта публікаваць асабістыя лісты паміж ягонымі маці і бацькам, але сыноўні і грамадзянскі доўг перамаглі — і «Лісты жыцця і кахання» пабачылі свет. Ліставанне Гаўрылы Іванавіча і яго любай жонкі Ларысы Восіпаўны, якія большую частку свайго жыцця амаль да вяртання ў Беларусь у 1969 г. пражылі ў разлуцы, «дапамагло выжыць і быць шчаслівымі, стварыць і захаваць добрую сям'ю, узгадаваць двух сыноў, дасягнуць вышыняў у прафесійнай дзейнасці. [...] Чытаючы гэтыя лісты, можна яскрава адчуць жыццё не проста адной сям'і, але і многія моманты падзей усёй краіны і свету» (Р. Г. Гарэцкі, «Лісты жыцця і кахання»).

Калі Гаўрылу Іванавіча арыштавалі, меншаму сыну было толькі паўтары гадочкі. Бацьку асудзілі да расстрэлу, які замянілі на 10 гадоў ссылкі ў Салаўкі. Як адукаваны спецыяліст, ён быў накіраваны на будаўніцтва Беламорска-Балтыйскага канала ў яго самай паўночнай частцы на Кольскай паўвыспе. Пачалося пакутнае, амаль на 40 гадоў, вандроўнае жыццё сям'і Гарэцкіх.

Працяг на стар. 9 (3) »

Цёплыя сустрэчы ў халодны лістапад

Нават халоднымі і шэрымі лістападаўскімі днямі Саюз беларускіх пісьменнікаў і грамадская культурніцкая кампанія «Будзьма беларусамі!» дораць сваім сябрам цёплыя і яркія сустрэчы.

Так, у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце адбылася літаратурна-музычная сустрэча з пісьменнікам, перакладчыкам і бардам Алесем Камоцкім. Як зазначыў сам выступоўца, вечарына была цёплай і нязмушанай. Гледачамі былі ўдзельнікі народнага тэатра «Жывое слова», які існуе пры універсітэце ўжо больш за 50 гадоў. Размаўлялі з тэатраламі пра рознае, у прыватнасці, пра ролю Саюза пісьменнікаў у сучасным задэвайшаным грамадстве. Таксама паспявалі. Што тычыцца рэпертуару, то выконваліся самыя разнастайныя песні, як на замову, так і з ініцыятывы выканаўцы.

А ў дзіцячай бібліятэцы № 10 Мінска адбылася сустрэча школьнікаў малодшых класаў з літаратуразнаўцам, пісьменнікам і бардам Сержам Мінскевічам, падчас якой паміж госцем і школьнікамі ўзнікла гутарка пра беларускі фальклор, выяўленчае мастацтва, кіна- і мультыплікацыйнае мастацтва, а таксама пра беларускую мову і літаратуру.

Школьнікі расказалі, якіх яны ведаюць беларускіх пісьменнікаў, што па-беларуску чыталі, якія ведаюць беларускія казкі, легенды. Нават расказалі свае легенды. А выступоўца прачытаў урыўкі са сваіх казак, праспяваў свае песні, шчыра адказаў на ўсе пытанні школьнікаў, настаўнікаў і бібліятэкараў.

У Цэнтральнай дзіцячай бібліятэцы імя М. Астроўскага адбылася этнакультурна-музычна-літаратурная сустрэча «Святыя Дзяды, прыходзьце сюды!..». Навучэнцы будаўнічага ліцэя разам з вядомым этнографам і паэтэсай Антанінай Хатэнка пад чароўныя гукі сакральных музычных інструментаў (музыка Кацярына Радзівілава) патрапілі ў незвычайнае падарожжа Памяці...


Вось што пра гэта распавяла спадарыня Антаніна:

«Некуды ў невядомасць, скуль спяшаліся ў гнёзды мудрыя птахі-Дзяды, свяцілі трапяткія свечкі. Некуды ў прышласць, снаваную са збыласці, узнімаліся вершы, песні і спаміны сучаснікаў, што знайшлі-такі вядунскі ключ Сутнасці і адкрылі найпершы і наймагутны закон Быцця — закон паяднання. Паяднання ўсяго, што было, ёсць і будзе. Усяго, што надае сэнс жыць, паміраць і паўратацца».

У бібліятэцы № 13 пасёлка Сосны ў межах кампаніі «Будзьма беларусамі!» і пры падтрымцы Саюза беларускіх пісьменнікаў адбылася сустрэча з музыкам Ярашам Малішэўскім і пісьменніцай Аксанай Спрынчан.

А вядомыя беларускаму чытачу Пэтсан і Фіндус наведалі Пружаны. Аўтар фэнтэзійнага рамана «Сем камянёў» Аляксей Шэін прэзентаваў у Пружанскім Палацыку новыя пераклады аповедаў Свэна Нурдквіста «Час пеўня» і «Мітусня ў агародзе». Дзеці і іх бацькі змаглі ўпершыню пабачыць пераклады знакамітых кніг на беларускую мову. Кнігарняў, на вялікі жаль, у Пружанах няма, няма таксама беларускага Пэтсана і ў пружанскіх бібліятэках. І яркія, цікавыя аповеды пра дзядзьку Пэтсана і яго коціка Фіндуса захапілі як малечу, так і дарослых.

У мінскай бібліятэцы № 2 малодшым школьнікам прапанавалі адправіцца ў цікавае падарожжа ў краіну, дзе людзі расказваюць легенды, казкі, дзеляцца сваімі ведамі пра прыроду. А праваднікам у гэтую краіну быў Серж Мінскевіч. Выступоўца расказваў легенды, казкі і паданні, спяваў свае песні і чытаў вершы, а вучні ўзгадалі сваіх бабуль і дзядуляў, распавялі гісторыі, пачутыя некалі ад іх. А таксама патанчылі пад песню Сержа Мінскевіча, паадгадвалі яго загадкі, падарылі шмат шчырых усмешак адно аднаму ды госцю...



Алесь Камоцкі і «Жывое слова»



Фота www.racyja.com

Галоўнае пытанне пра расстраляных паэтаў

Яно гучыць так: чаму б дзяржаве на гэтым этапе, у 2018-м, праз 81 год, не адасобіцца катэгарычна ад злачынстваў НКУС? Навошта гэтае двудушніцтва? Навошта бясконцая гульня ў «прызнаем — не прызнаем»? У чым яе глабальны сэнс?

З 1991 года на мапе свету існуе незалежная Рэспубліка Беларусь, якая не нясе непасрэднай адказнасці за злачынствы, здзейсненыя ў 1937-м саветамі. Дзяржава можа станавіцца на пазіцыю тых, хто расстрэльваў, пераймаць іх логіку і іх падман толькі ў тым выпадку, калі ёй з нейкіх цьмяных прычынаў самой хочацца за іх заступацца.

Бо ад яе гэтага не чакаюць. Ніхто не чакае. Насельніцтва не чакае, бо насельніцтву заўсёды нашмат больш важныя заробкі. Да таго ж шмат у каго прадзедаў пасеклі кулямі, то чаго б ім спачуваць катам? Еўропа не чакае, бо ёй, Еўропе, было б прасцей размаўляць з элітамі, якія разабраліся ў сабе і сваёй гісторыі. І нават Расія не «замаўляе» таго заступніцтва, бо Расія выбудавала сваю «новую савецкасць» праз вырачэнне ад заганаў «старой савецкасці». Логіка такая: савецкія НКУС і КДБ былі дрэннымі, мы гэта прызнаем, але мы — не НКУС і КДБ. І наш новы «Савецкі Саюз», з ягонымі ФСБ і ГРУ, будзе белым і пушыстым. Так, мы зноўку ўступаем у гонку ўзбраенняў і на ўвесь свет кажам, што «рыхтуемся да вайны», але ж мы гэта робім з чыстага ліста і ад усяго сэрца. Бо на свежую галаву вырашылі, што гэта адзіны магчымы для нас напрамак думкі. Не можам мы без «Чапігі» з «Башыравым»! Але нікому тут не прыходзіць у галаву ляпнуць з экрана тэлевізара, што «ГУЛАГ» стварылі фашысты». І я нават не ведаю, што б зрабілі з дзіваком, які б сказаў, што «ў ГУЛАГУ сканалі тыя, каго, можа, і трэба было забіць»...

Беларускай дзяржаве ж чамусьці гэтая простая рэч — адмежаванне сябе ад НКУС — катастрафічна не даецца. Беларусь не проста святкуе стагоддзе камсамола — яна робіць выгляд, быццам гэта яна, Беларусь, той камсамол заснавала. Незалежнасці 27 гадоў, камсамолу — 100, і нічога! Ва ўсіх усё зрастаецца. Але ў гэтым ёсць нешта большае за спробу выглядаць больш старажытнымі, больш абцяжаранымі традыцыямі і часам — большымі, чым мы ёсць насамрэч. Бо калі б рэч была толькі ў пагоні за штучнай спадчынай, пісалі б на плакатах «Беларускай міліцыі 630 гадоў», а не «Беларускай міліцыі 100 гадоў». Ягайла, «паспалітае рушанне» і г. д. — падставаў звязваць з сучаснасцю не меней, чым атаясамліваць сябе з савецкім НКУС. Але менавіта з НКУС, камсамолам, а не з ВКЛ ці Ягайлам яны сябе асацыююць.

І так, зразумела, што СССР ім родненькі, а ВКЛ ці Рэч Паспалітая — не. Але ж нават паўторную каланізацыю савецкай гісторыі можна было б ажыццявіць без уцягнення ў сваю будучыню крывавых праклёнаў чорных начэй 1937 года.

Чаму так трымаюцца за 1937-ы? Ці не таму, што ў любога тутэйшага прыхільніка «чырвоненькага» ў форумных баталіях раз-пораз абавязкова ўсплывае наган? У Нямеччыне кажуць, што ў любой лаянцы, якая цягнецца даўжэй за 15 хвілін, абавязкова хтосьць згадае Гітлера, каб абразіць суразмоўцу. У Беларусі спрэчка пра савецкае мінулае няўмольна па дасягненні пэўнай гучнасці віску выцягвае аргумент, што мы, маўляў, вас, сссук, яшчэ вывезем у ярочак. Яшчэ паставім на ўскраек яміны. Яшчэ пульнём вам у патыліцу. Што ты за чырвоны, калі не марыш стаць камісарам? Што ты за камісар, калі хаця б раз не ўяўляў сябе на сцюдзёным ветры ў скуранцы да пят, з чапаеўскай шабляй падпахай, з пісталетам, з якога чпокаеш ворагаў народа?

Сённяшнім камсамольцам не прасцей прызнаць, што ў Курапатах ляжаць ахвяры НКУС, чым было гэта зрабіць камсамольцам савецкім. Ну сапраўды: дзіўна было б чакаць, што верныя ленінцы пагодзяцца з тым, што іншыя верныя ленінцы патапілі краіну ў юшцы.

Але я прапусціў момант, калі тыя «верныя ленінцы» раптам сталі ў Беларусі галоўнай інстанцыяй, што адказвае за сярэднюю і вышэйшую адукацыю. Праглядаў фоткі «святочных мерапрыемстваў да 100-годдзя камсамола» з Твітара і Інстаграма і не мог зразумець: Хэлоўін? Касплэй? Адкуль яны ўзялі мар'іванаўнаў з майго дзяцінства?

І як гэтыя Мар'і Іванаўны выкладаюць беларускую літаратуру? Беларускую гісторыю? Як кажуць пра саму беларускасць?

«Дзеці, сягоння мы будзем прахадзіць творчаства вялікага беларускага савецкага паэта Цішкі Гартнага, імям якога названа вуліца Жылуновіча, на каторай стаіць Адміністрацыя Завадскога раёна сталіцы, у якім знаходзіцца наша школа. Цішка Гартны работаў рэдактарам газеты «Савецкая Беларусь», якая выходзіць і сягоння. Напісаў першы беларускі раман «Сокі цэліны». У наябры 1936-га года... ён быў... арэстован за связь з фашысцкімі і нацдэмскімі элементамі... І за гэта яго... справядліва поўнасцю, я шчытаю. У Магілёўскую псіхіятрычную лячэбніцу. Дзе ён... Так сказаць... Ой... Нешта душна тут... Ну, кароча, вы самі разумееце. Заўтра прыходзьце на мерапрыяціе па 100-лецію абразаванія Ленінскага камсамола»...

Стагоддзе камсамола супраць Ночы расстраляных паэтаў... Усё як было 81 год таму. Адны адкрываюць шампанскае, іншыя імкнуцца ў цемру, на холад, пад дождж. Усюды гэтае дужанне ўжо скончылася: на ўсходзе ад нас перамог «новы камсамол», на поўдні, поўначы і захадзе — «Ноч расстраляных паэтаў». Мы ж мусім кожны год праходзіць праз выпрабаванне. Мы ж кожны год мусім назіраць, як камсамол узбіраецца на высокія трыбуны, а знішчаныя творцы застаюцца ў сутонні народнай памяці.

Уявіце сабе якую-небудзь дзіўную мелодыю, напісаную стагоддзі таму. Напрыклад, мадрыгал «Zefiro torna e'l bel tempo rimena» Клаўдыя Мантэвердзі. А цяпер уявіце, што чалавецтва не вынайшла спосабу занатаваць гэтыя цудоўныя шматгалоссі. Што нотнай граматы не існуе ў прыродзе. І што, прагучаўшы адзін, два, дзесяць разоў, — аж покуль не памрэ апошні чалавек, які памятаў пра яе, — гэтая мелодыя знікне назаўсёды. Расстраляная паэзія для мяне — нешта гэтага кшталту. Калі вы не збіраліся ў Курапаты ў ноч з 29-га на 30-га — хаця б адкрыйце вершы Уладзіміра Жылкі ці Алеся Дудара ды пачытайце. Бо пакуль вы іх чытаеце, яны жывыя.

Дзяржаве ж самы час схаваць наган і скуранку куды далей.

Віктар Марціновіч, budzma.by

Бацька і сын Гарэцкія

« Працяг.
Пачатак на стар. 7(1)


І хаця ў 1934 г. пасля датэрміновага вызвалення Гаўрылы Іванавіча сям'я аб'ядналася, ёй можна было жыць толькі ў месцах яго зняволення ў Коле, Туломе і Мядзвежай Гары на Кольскай паўвыспе ды іншых далёкіх ад Беларусі краёх. Потым былі яшчэ арышты 1937-га і самы страшны — у 1938-м, пасля якіх Гаўрыла Іванавіч доўгі час працаваў інжынерам-геолагам на будоўлях вялікіх і малых гідраэлектрастанцый, каналаў і плацін у арганізацыях, падпарадкаваных НКУС.

Для Радзіма і яго брата Усяслава лісты бацькі ў дзяцінстве і, бадай, да канца студэнцкіх гадоў былі магутнай падтрымкай, праяўленнем бацькоўскай любові, клопату і дапамогі, выхоўвалі ў іх лепшыя чалавечыя якасці, загартоўвалі характар. У перапісцы з бацькам Радзім з 9-га класа пачаў пісаць па-беларуску, засвойваць родную мову, бо даводзілася жыць і вучыцца ў рускамоўным асяроддзі ды яшчэ ў 13-і розных школах ад Колы ў Мурманскай вобласці да Чкалаўску пад Ніжнім Ноўгарадам. Здзіўляе загадкавая сувязь бацькі і сына праз почырк, бо рукапісныя старонкі Радзіма Гарэцкага цяжка адрозніць ад почырка Гаўрылы Іванавіча. Моцная спадчыннасць выявілася, нягледзячы на тое, што бацькі не было побач амаль усе школьныя гады.

Загартоўваўся характар Радзіма Гарэцкага і ў гады ваеннага ліхалецця, калі ён з маці, яе бацькамі і яе братавай з восені 1941 г. жылі ў эвакуацыі ў сяле Вавоўж ва Удмурціі. Пачуццё пастаяннага голаду суправаджала Радзіма Гаўрылавіча з самага ранняга маленства і амаль усе студэнцкія гады, нягледзячы на намаганні маці і бацькі, які рэгулярна прысылаў частку свайго сціплага заробку для падтрымкі сям'і.

Напрыканцы ліпеня 1943 г. сям'я з трох чалавек аб'ядналася ўпершыню за доўгі час. Да Гаўрылы Іванавіча, які жыў і працаваў у Чунжыне (пасёлак на беразе Уральскай ракі Чусавая) пераехалі з Вавожа спачатку Ларыса Восіпаўна, потым і Радзім. Старэйшы сын Славік тады працаваў токарам у Маскве на аўтамабільным заводзе імя Сталіна (ЗІС). Малодшага сына паслалі на лесапавал, але Гаўрыла Іванавіч праз некаторы час змог уладкаваць яго рабочым на геалагічных вышуканнях.

Кніга «Академик Яншин — дорогой мой учитель и друг» (2005) напісана па-руску, бо выдавалася ў Маскве Інстытутам праблем нафты і газу РАН. Уражанне ад гэтага твора мастацкай літаратуры надзвычай моцнае і незабыўнае, бо гэта і дакументальная аповесць пра знакамітага сусветна вядомага вучонага — геолага і даследчыка прыроды Аляксандра Леанідавіча Яншына, якім ганарацца і геолагі Беларусі, бо ён — «ліцвін са Смаленску», і цікавыя даследаванні на шляху сцвярджэння ў навуцы 1960-х гадоў новай глабальнай



Усяслаў і Радзім Гарэцкія. Пасёлак Кола, дзе Гаўрыла Гарэцкі працаваў на будаўніцтве Беламорска-Балтыйскага канала, ліпень 1936 г.

тэктонікі (тэктонікі пліт) і яе важнай часткі — вучэння аб маладых платформах, і пра тое, як выпускнік геолага-разведачнага факультэта Маскоўскага нафтавага інстытута Радзім Гарэцкі стаў знакамітым тэктаністам і лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі СССР. Роля А. Л. Яншына ў лёсе Радзіма Гарэцкага выявілася ў запрашэнні яго працаваць у Геалагічным інстытуце Акадэміі навук СССР. Пры заканчэнні Маскоўскага нафтавага інстытута Радзім Гарэцкі атрымаў накіраванне на працу ў Геалагічнае ўпраўленне БССР. Гэтаму былі рады і бацька і сын, бо Гаўрыла Іванавіч тады ўжо рабіў намаганні вярнуцца на працу ў Беларусь. Была праверка ў пэўных органах як сына неадноўчы рэпрэсаванага «ворага народа»...

За час згаданай працы (1952–1971 г.) у Радзіма Гаўрылавіча ў поўнай меры развіўся талент вучонага і арганізатара. Яго надзвычайная працавітасць, звычка да напружанай працы, выдатныя веды па спецыяльнасці, адказнасць за даручаную справу, добрасумленнасць, лагодны характар — у адносінах з людзьмі, але цвёрды ў прынцыповых момантах, спрыялі поспехам і аўтарытэту ў калектыве.

У знакавым у навуковай кар'еры Радзіма Гаўрылавіча 1969 г. яму прысудзілі званне доктара геолага-мінералагічных навук за працу «Тэктоніка маладых платформ Еўразіі», і ён стаў лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі СССР.

У тым жа 1969 г. Гаўрыла Іванавіч з Ларысай Восіпаўнай пераехалі ў Мінск (у 1954 г. з Г. І. Гарэцкага была знята судзімасць, а ў 1958 г. ён быў рэабілітаваны). У званні акадэміка АН БССР Г. І. Гарэцкі быў адноўлены ў 1965 г. На працу ў Беларусь Гаўрыла Іванавіч змог вярнуцца толькі праз 10 доўгіх гадоў пасля рэабілітацыі — спачатку старшым навуковым супрацоўнікам Лабараторыі геахіміі і геафізікі, а пры ўтварэнні ў 1970 г. на базе гэтай лабараторыі Інстытута геахіміі і геафізікі АН БССР узначаліў аддзел геалогіі і палеапатамалогіі антрапагену. Пакутлівы шлях да роднай Беларусі завяршыўся, калі Гаўрылу Іванавічу было 69 гадоў. Галоўнай мэтай жыцця і працы ў Акадэміі Навук было стварэнне навуковай школы даследчыкаў і вывучэнне геалогіі і выяўленне карысных выкапняў як неабходнай падставы гаспадарчага росквіту Бацькаўшчыны. Заставалася яшчэ гарачае жаданне, каб і яго сын, ужо знакаміты геолаг-тэктаніст, таксама працаваў разам з бацькам у Беларусі. І ў 1971 г. прэзідэнт АН БССР М. А. Барысевіч запрашае Р. Г. Гарэцкага на працу ў Мінск,

Чытаць тэксты Радзіма Гарэцкага — асалода і ўзрушанасць надзвычайна высокія, бо ў іх нанова перажываеш падзеі і з'явы, сведкамі і ўдзельнікамі якіх былі мы самі

у Інстытут геахіміі і геафізікі АН БССР. У снежні таго ж года Радзім Гаўрылавіч вяртаецца на Радзіму і ўзначальвае створаны ў інстытуце аддзел агульнай і рэгіянальнай тэктонікі. У хуткім часе ён становіцца прызнаным лідэрам тэктанічнай школы Беларусі і Прыбалтыкі, дырэктарам інстытута, а ў 1992–1997 гадах — віцэ-прэзідэнт НАН Беларусі.

Праца ў Беларусі адкрыла новыя перспектывы і дала магчымасць апантана служыць на карысць беларускай геалагічнай навукі, культуры і грамадства (падрабязна аб навуковай і грамадскай дзейнасці акадэміка Р. Г. Гарэцкага і калектыву тэктаністаў, геафізікаў, сейсмолагаў ды іншых спецыялістаў-геолагаў Беларусі пры ўдзеле і пад яго кіраўніцтвам выдатна напісаў адзін з лідэраў рэгіянальнай і нафтавай геалогіі Беларусі член-карэспандэнт Р. Е Айзберг — гл.: «Радзім Гаўрылавіч Гарэцкі. Бібліяграфія вучоных Беларусі». — Мінск, 2013).

А я трымаю ў руках кнігу Радзіма Гарэцкага «Апантаны Бацькаўшчынай. Жыццёвы меланж-2», якая выдадзена ў Мінску ў 2018 годзе накладам 150 асобнікаў. Я адна з нямногіх, хто мае кнігу ды яшчэ з дарчым надпісам! Ёсць і першая кніга — «Жыццёвы меланж» (2013), наклад якой аж... 300 асобнікаў! Гэта кнігі новага жанру мастацкай літаратуры, створанага пісьменнікам Радзімам Гарэцкім. Вось як сам аўтар характэрызуе гэты жанр у «Прадмове» да першай кнігі. «Жыццёвы меланж — так я называю жанр кароткіх замалёвак, мініяцюр, нярэдка блізкіх да вытрымак з дзённікавых запісаў, якія тычацца розных здарэнняў, праяў, эпізодаў штодзённага жыцця і выкліканых імі пачуццяў, думак. Сюды ж трапляюць успаміны ці роздумы пра розных сяброў, знаёмых, выдатных дзеячаў літаратуры, культуры, навукі, часта звязаныя з іх юбілейнымі датамі» («Жыццёвы меланж», 2013). Аўтар тлумачыць, што геолагі успрымаюць меланж (ад французскага «сумесь») як назву горнай пароды, якая ўтвараецца пры стрэсавых з'явах, напрыклад, ад насоўвання з вялікай сілай аднаго блока зямной кары на другі, у выніку ў разломныя зоны трапляюць адломкі разнастайных па рэчавым складзе і па колеры парод, якія і ўтвараюць прыгожыя стракатыя адклады пад назвай меланж. І далей — глыбокая філасофская выснова: «Так у жыцці людзей уздзеянне чалавека на чалавека, адной супольнасці людзей на другую, краіны на краіну, прыродных фенаменаў і самых разнастайных з'яў выклікаюць стрэсавыя сітуацыі як станоўчыя, так і адмоўныя, якія і застаюцца ў памяці чалавека. Так узнікае «жыццёвы меланж» (там жа). Як сцвярджае сам аўтар, у літаратуры жыццёвы меланж яго пачаўся з кнігі «Вечна жыве Беларусь» (2003), у якой сабраны артыкулы, выступленні, інтэрв'ю акадэміка Р. Г. Гарэцкага за пяць гадоў.

Адметнай рысай сучаснага літаратурнага жыцця ў Беларусі з'яўляецца тое, што многія выдатныя творы беларускамоўных пісьменнікаў упершыню друкуюцца за мяжой. Так здарылася і з «Жыццёвым меланжам» Радзіма Гарэцкага, «лірычная проза» якога ўпершыню пабачыла свет у беларускамоўным часопісе «Тэрмапілы», што выдаецца ў Беластоку (Польшча). У гэтым часопісе таксама публікаваліся творы Ніла Гілевіча і Анатоля Вярцінскага.

Чытаць тэксты Радзіма Гарэцкага — асалода і ўзрушанасць надзвычайна высокія, бо ў іх нанова перажываеш падзеі і з'явы, сведкамі і ўдзельнікамі якіх былі мы самі за апошнія 27 гадоў. Позірк на іх нашага знакамітага Суайчынніка, Вучонага, Інтэлігента, Чалавека высокай духоўнасці, адданага Бацькаўшчыне, — невычэрпная крыніца Натхнення, Веры і Надзеі на шчаслівую будучыню Беларусі.

Радзім Гаўрылавіч Гарэцкі да гэтага часу плённа працуе галоўным навуковым супрацоўнікам у лабараторыі геатэктонікі і геафізікі Інстытута прыродакарыстання Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Яго кожны дзень можна «знайсці» на працоўным месцы, абмеркаваць з ім самыя складаныя пытанні, атрымаць параду, падтрымку і дапамогу. З'яўляюцца ў друку яго навуковыя артыкулы і сумесныя манаграфіі з новымі ідэямі і канцэпцыямі, у перыядычным друку — нарысы на хвалюючыя тэмы жыцця нашай незалежнай краіны, аповеды пра знакамітых суайчыннікаў. Абдумваюцца планы і сюжэты новых кніг навуковай і мастацкай літаратуры, рэдагуюцца манаграфіі даследчыкаў Беларусі і другіх краін, чарговыя нумары часопісаў, здзяйсняецца праца па захаванні спадчыны Максіма і Гаўрылы Гарэцкіх, па выданні матэрыялаў штогадовых «Чытанняў братоў Гарэцкіх» (у 2018 г. адбыліся 25-я чытанні), абмяркоўваюцца дысертацыі, якімі кіруе або якім апаніруе, прапаноўваюцца тэмы новых пошукаў і прагнозаў карысных выкапняў і шмат іншага, што на самым высокім узроўні можа зрабіць толькі Радзім Гаўрылавіч Гарэцкі.

Захопленасць навукай, служэнне любай Бацькаўшчыне, высокія чалавечыя якасці прыцягваюць да Радзіма Гаўрылавіча ўсіх, хто яго ведае. Яму ўласцівы шляхетная інтэлігентнасць, аптымізм і добразычлівасць, дэмакратызм, увага да калег і вучняў, здольнасць бачыць галоўнае ў складаных праблемах. Ён — маральны аўтарытэт і жыццёвы арыенцір для ўсіх, каму дарагая Беларусь.

Радзім Гаўрылавіч Гарэцкі — адзін з тых, хто працягвае ствараць Беларусь, аб якой марыў яго бацька: заможнай, культурнай, адроджанай, вольны народ якой сацыяльна і нацыянальна свядомы, не саромецца «беларусам звацца». «І над усім — ва ўсім — перш за ўсё Вялікае Роднае Слова, Мова, крыніца жыцця, падстава неўміручасці, душа і сэрца народа, яго Бог, яго жыццё, сам народ». (З запісной кніжкі Г. Гарэцкага, «Ахвярую сваім «Я», 1998).

Напярэдадні Юбілею вельмішаноўнага Радзіма Гаўрылавіча шматлікія прыхільнікі яго Таленту і яго Спраў, беларусы ўсяго свету зычаць яму моцы духу, добрага здароўя, шчасця і радасці ад сваёй вялікай і так неабходнай сучаснікам працы дзеля светлай будучыні нашай Бацькаўшчыны!

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 11 (147) | 30 лістапада 2018 | № 44 (607) Новы час

«Гэта супярэчыць інтарэсам беларускага народа»

Моўная акцыя 1968 года з гледзішча навуковага камунізму

У 1966-м я прыехаў у Менск вучыцца ва ўніверсітэце на біяфаку. Пасяліўся ў інтэрнаце на Паркавай магістралі. І хоць з'явіліся новыя сябры, прыяцелі, было адчуванне самоты.



Алесь Разанаў. Фота Андрэя Лянкевіча

Горад — беларуская сталіца — быў прасякнуты чужым духам. Нідзе не чуваць роднай мовы, пройдзеш па праспекце — усяго дзве-тры шыльды па-беларуску, як адчэпнае: «Чаравічкі», «Паўлінка». Мне гэта балела, закранала маю годнасць. І, што асабліва засмучала, не было з кім пагаварыць. З суседзямі па інтэрнаце адразу пастанавіў размаўляць па-беларуску, але ніхто не адказаў узаемнасцю. Так і павялося: я па-беларуску, да мяне — па-расейску. Не скажу, што ўсе былі абыякавыя. Хтосьці ставіўся спачувальна, шкадуючы, што мову заціскаюць. Нехта, асабліва з старшакурснікаў, пасміхаўся з майго «дзівацтва». А бальшыня, мабыць, не дужа пераймалася гэтым або проста прымала як наканаванасць, што пры камунізме застанецца толькі адна мова — нездарма ж афіцыйнай палітыкай у нацыянальным пытанні было «збліжэнне і зліццё моў».

Пры канцы кастрычніка 1968 года па інтэрнаце пайшла пагалоска, што студэнты філфака выступілі на абарону беларускай мовы. Брат нашай аднакурсніцы Аляксандр Дабрыян якраз вучыўся там, здаецца, на чацвертым курсе, і ад яго я даведаўся падрабязнасці: Алесь Разанаў з сябрамі арганізавалі на беларускім аддзяленні збор подпісаў за навучанне на роднай мове. Добра памятаю, як узрушыла мяне гэтая навіна. Не адкладваючы, у той жа вечар падняўся на паверх, дзе жылі філолагі. Знайшоў патрэбны пакой і, папрасіўшы Алеся выйсці на хвілінку, сказаў, што рады пазнаёміцца з ім і ўсцешаны, што ёсць у нас такія людзі. Крыху пагутарылі. Алесь распытаў, адкуль я, хто мае бацькі. Потым не раз сустракаліся, ён пазнаёміў мяне з Віктарам Ярацам, Лявонам Барташам, Яўгеніяй Янішчыц. Апавядаў, як драматычна развіваюцца падзеі на філфаку.

Пад канец года, у снежні, я запрасіў яго на сваю радзіму, у вёску Азярычына. Памятаю, як цёмначы, марозлівым вечарам, пешшу ішлі ад чыгуначнай станцыі. У гутарцы непрыкметна адолелі дванаццаць кіламетраў дарогі. Бацькі сустрэлі Алеся як дарагога госця. Назаўтра была доўгая зацікаўленая размова. Пазней сябар прызнаўся, што менавіта гэтая сустрэча канчаткова пераканала яго, з кім ён мае справу.

Зімовую сесію Алесь здаваў датэрмінова. Па ўсіх дысцыплінах атрымаў адзнакі выдатна або добра, акрамя вайсковай падрыхтоўкі, па якой яго «завалілі»: не ўклаўся ў вызначаны час з разбіраннем-збіраннем аўтамата Калашнікава. Фактычна справа ішла да выключэння з універсітэта... Дзякуючы падтрымцы Максіма Танка і Уладзіміра Калесніка, Алесь быў залічаны на трэці курс Берасцейскага педінстытута. Па нейкім часе я намерыўся з'ездзіць туды, каб маральна падтрымаць сябра. Мой старэйшы брат Юрась падахвоціўся далучыцца, і мы разам з ім 24-га красавіка прыехалі ў Берасце. Знайшлі інстытут, факультэт. У вестыбюлі ўбачылі Алеся ў атачэнні грамады студэнтаў і зразумелі, што наша маральная падтрымка яму, відаць, не дужа і патрэбная. Цёпла прывіталіся, распыталі адзін аднаго пра жыццё. Алесь прапанаваў далучыцца да іх кампаніі, што збіралася ў вандроўку па Белавежскай пушчы. На жаль, мы не маглі пакарыстацца з гэтай прапановы...

У канцы 1969 года, калі я быў на чацвертым курсе, адбылася такая гісторыя. Іван Іванавіч Уласенка вёў у нас курс навуковага камунізму. Лекцыі чытаў не спяшаючыся, паволі, каб усе паспелі запісаць. Калі трэба — паўтараў. Нашыя папярэднікі, студэнты старэйшага курса, казалі пра яго: «Маеш канспект — пяцёрка гарантаваная». Не патрэбныя былі ні падручнікі, ні дадатковая літаратура. Запісаў, вывучыў, здаў. Вось мы і пісалі.

Чарговы семінар (па міжнацыянальных дачыненнях) Іван Іванавіч, з нейкіх меркаванняў, пастанавіў зрабіць аб'яднаным: правесці яго адначасова з дзвюма групамі (а гэта прыблізна паўсотні студэнтаў). Усё ішло вызначаным парадкам, аж покуль ён не закрануў нядаўнія падзеі на філфаку, дзе Алесь Разанаў з сваімі аднадумцамі Віктарам Ярацам і Лявонам Барташам наладзілі збор подпісаў пад петыцыяй наконт выкладання вучэбных дысцыплін на факультэце па-беларуску. Не называючы імёнаў, Уласенка ахарактарызаваў гэтую акцыю як нацыяналістычную.

Тут раптам мой сябар, Юзік Прышчэпа, з якім мы жылі ў адным пакоі студэнцкага інтэрната, выгукнуў з месца: «А за што іх выгналі з універсітэта?!». У ягоным пытанні, асабліва ў тоне, якім яно было прамоўлена, чуліся і выклік, і пратэст. Юзікаў дэмарш быў для мяне нечаканым, хоць і цалкам вынікаў з ягонай запальчывай, экспансіўнай натуры.

Упэўнены ў сабе, Іван Іванавіч спакойна адказаў, што не ведае, выгналі іх ці не, аднак, калі б гэта залежала ад яго, то ён выгнаў бы. Адзначыў пагрозліва, што за пытаннем, якое тут прагучэла, ён бачыць пэўныя ўплывы нацыяналістычных колаў, асяродак якіх атабарыўся ў Акадэміі навук, і на гэта варта звярнуць пільную ўвагу. Каб паказаць, да чаго такія настроі могуць спрычыніцца, ён згадаў незайздросную долю сваіх сяброў-аднакурснікаў, з якімі вучыўся некалі ў Маскве. У выніку размеркавання яны трапілі ў Эстонію і адтуль у 1953-м ці 1954-м годзе, пасля смерці Сталіна, іх выперлі.

Што да беларускай мовы, дык тут для нашага выкладчыка ўсё было зразумела: яна недастаткова развітая, не мае распрацаванай навуковай тэрміналогіі, не можа абслугоўваць усе патрэбы сацыялістычнага грамадства і, самае галоўнае, народ ад яе адмаўляецца. Да скарбаў сусветнай культуры беларусы далучаюцца праз расейскую мову, гэта мова будучыні. Трымацца за беларускую мову, якая ўжо аджыла сваё, — гэта супярэчыць інтарэсам беларускага народа, які разам з усім савецкім народам упэўнена крочыць да камунізму.

Паставіўшы такім чынам тоўстую кропку на тэме, І. І. Уласенка дзяжурна запытаўся, ці ёсць яшчэ якія пытанні. Пытанняў ні ў кога не было... Мяне тым часам прыгнятала думка, што пакідаю сябра ў няпростай сітуацыі ў адзіноце. І хоць я не штурхаў Юзіка на гэтую авантуру, усё ж адчуваў маральную адказнасць за яго: калі б не мой уплыў, ён таго пытання, можа, і не задаў бы... Я падняў руку.

Мне было што сказаць, да таго часу я прачытаў ужо кнігу Язэпа Найдзюка «Беларусь учора і сяньня: Папулярны нарыс з гісторыі Беларусі» (Менск, 1944). Зместам майго выступу было зняпраўджанне Уласенкавых тэзаў пра нашую мову. Пачаў я з таго, што ў 20-х гадах беларуская мова была дзяржаўнаю, на ёй вучылі ва ўсіх навучальных установах, у тым ліку вышэйшых, вялі справаводства ў савецкіх і партыйных органах. Падкрэсліў, што нашая мова была моваю навукі: былі выдадзены 24 выпускі беларускай навуковай тэрміналогіі. Але на пачатку 30-х гадоў па сфабрыкаванай ГПУ справе «Саюза Вызвалення Беларусі» сотні пісьменнікаў, навукоўцаў, дзеячоў культуры — квецень нацыі — былі арыштаваны і па нейкім часе расстраляныя. Скончыў жыццё самагубствам прэзідэнт Беларускай акадэміі навук Усевалад Ігнатоўскі, спрабаваў зрабіць сабе харакіры Янка Купала. Пасля знішчэння нацыянальнай інтэлігенцыі пачалася русіфікацыя. Беларускую мову ўжо не было каму бараніць, яе выгналі з уладных структур, з вышэйшай школы. Вось чаму яна стала непрэстыжнай. А не таму, што бедная і няразвітая.

Мой выступ не пакінуў аўдыторыю абыякавай. Па чарзе ўставалі Рыгор Долбік, Тацяна Бяляева, нехта яшчэ (здаецца, Валодзя Касмачоў). Яны гаварылі ў асноўным пра тое, што беларускую мову трэба ведаць хоць бы дзеля таго, каб чытаць беларускіх пісьменнікаў у арыгінале. Аднак для мяне і гэта было вялікай маральнай падтрымкай... Іван Іванавіч змаўчаў, нічога не каментаваў.

На перапынку пасля семінара дыскусія прадоўжылася ў калідоры. Я ў ёй удзелу не браў. Шчыра кажучы, хацелася расслабіцца, бо, як для мяне, псіхічная напруга была занадта вялікая. Стоячы непаводдаль, я толькі слухаў, што казалі мае аднакурснікі. Але да мяне падышоў Аркатаў (гаварылі, што ён генеральскі сын). Манерна адставіўшы нагу і пакручваючы цыгарэту, ён сказаў: «В тридцать третьем году в Германии все начиналось так же». Што можна было адказаць на гэтую лухту? Я толькі пасміхнуўся.

Назаўтра Мікола Лемяза, староста нашага курса, спаткаўшы нас з Юзікам, папярэдзіў: «Ну, хлопцы, рыхтуйцеся! Пасля семінара Уласенка паклікаў мяне і папытаўся вашыя прозвішчы».

Мы і самі не цешылі сябе ілюзіямі, выдатна разумелі, што нам тое дарэмна не пройдзе. Не чакаючы сесіі, узяліся за падрыхтоўку. Студыявалі не толькі канспект, але і ўсе даступныя падручнікі, іншую літаратуру. Вучылі так, што пара з галавы ішла. Што да Юзіка, дык ён увогуле не вылазіў з чытальнай залі. Зубрыў, як тады казалі, «аж нос гнуўся»...

Білет мне трапіўся нескладаны. Калі настаў час адказваць, Іван Іванавіч, спаслаўшыся на тое, што яму трэба на кафедру, выйшаў, пакінуўшы замест сябе аспіранта Вячаслава Бянькоўскага. Той выслухаў, пачаў задаваць дадатковыя пытанні тыпу: «Які працэнт кааперацыі ў сельскай гаспадарцы Польшчы?» Я адказаў, што невялікі, але дакладнай лічбы назваць не магу. «А ў Югаславіі?» — працягваў ён... Я ведаў, што навуковы камунізм — навука спецыфічная, асаблівая сваёй неабсяжнасцю. Але тут, на экзамене, я напоўніцу адчуў сябе ў ёй прафанам. «Ну вот, видите, — рэзюмаваў Бянькоўскі, — на основные вопросы вы ответили хорошо, а в дополнительных совершенно не ориентируетесь. Больше тройки поставить не могу». Я не хацеў такога «ўпрыгожання» ў сваім дыпломе і сказаў, што буду пераздаваць. Мой сябар, дарма што па праграме ведаў усё на памяць — «аж ад зубоў адскоквала», атрымаў двойку... Пераздавалі мы самому Уласенку. Як і звычайна ў такіх выпадках, адзнака павысілася кожнаму з нас усяго на адзін бал. Мне Іван Іванавіч пра тую справу і словам не згадаў, а вось Юзіка, паводле ягоных словаў, зневажаў.

На пятым курсе, а гэта быў ужо 1971 год, Анатоль Цімафеевіч Пікулеў прапанаваў мне застацца на кафедры біяхіміі і біяфізікі і паступаць у аспірантуру. Такі гонар выпадаў аднаму чалавеку з курса і тое не штогод. У сувязі з гэтым ён пацікавіўся, ці ёсць у маёй заліковай кніжцы лішнія «чацвёркі» і па якіх прадметах. Яму, як загадчыку кафедры, хацелася, каб у мяне быў «чырвоны» дыплом. Для гэтага сапраўды пару экзаменаў трэба было пераздаць. Я назваў тыя прадметы. Пачуўшы пра навуковы камунізм, Анатоль Цімафеевіч запэўніў: «Ну, гэта ўвогуле не праблема!»... Аднак болей да пытання аспірантуры ён не вяртаўся, а да пераэкзаменавання і пагатоў. Відаць, на кафедры навуковага камунізму яго адгаварылі ад тых планаў у дачыненні да мяне. Юзік Прышчэпа, зразумела, таксама меў праблемы з размеркаваннем.

З Алесем Разанавым мы пасля рэгулярна ліставаліся — калі ён служыў у войску і калі я вучыўся ў Маскве. Абменьваліся навінамі, думкамі пра наша жыццё, сваімі планамі. А калі я, абараніўшы дысертацыю, вярнуўся ў Менск, супрацоўнічалі ў грамадскіх справах. Дзякуючы Алесю я пазнаёміўся з выдатнымі людзьмі, самаахвярнымі патрыётамі: Арсенем Лісам, Міколам Прашковічам, Ларысай Геніюш, Алесем Каўрусам, Яўгенам Кулікам, Міхасём Чарняўскім, Алесем Зайкам, Міколам Пракаповічам, Віктарам Маркаўцом, Міхасём Раманюком, Генадзем Сакаловым, Міколам Ермаловічам, Алесем Лабанком, Віктарам Сташчанюком, Пётрам Драчовым, Ірынай і Аляксеем Марачкінымі, Міколам Купавам. Шмат хто з іх стаў маім сябрам на ўсё жыццё.

Зміцер Санько

Прачнуцца дома



Іна СНАРСКАЯ

Абляпіхіны слёзы

Што адчувала бабуліна хата,
калі яе руйнавалі,
выбівалі вокны, рушылі печ,
разбіралі ганак?..
З фотаздымкаў на бяздушную тэхніку
глядзелі вочы маіх далёкіх
і блізкіх сваякоў.
Іхніх слёз не бачыў ніхто,
акрамя абляпіхі,
якую пасадзіў каля хаты мой бацька.
Абляпіха ўвабрала боль і слёзы
бабулінай хаты,
таму яе духмяныя ягады заўсёды
горкія.

Хата

«Дзе той гладыш? Дзе кварта тая?»
Анатоль Вярцінскі

На ўскрайку стамлёнай душы
Пытае блакітная кветка:
— Чаму ўспамінаеш так рэдка
Даёнку, фатэль, гладышы?
І печ, і куфэрак — усё
З бабулінай хаты спрадвечнай
Засыпалася небыццём,
І друзам, і хмызам, і веццем.

У хату ласкава прайсці
Дазволілі мне. Пустэча
Няволяй сірочых айчын
Мае знепрытоміла плечы.

Ні слоіка на стале,
Ні дзежкі з мукой ці мукай.
Пустэча ўсміхнулася мне
Шчарбатай нямой разлукай.

І трэснула раптам акно,
І бразнулі клямкай сені,
І анёлы з маіх сноў
На вусцішны ганак селі.

* * *

Адыходзяць суніцы
за сінія горы, за малочныя рэкі,
ляцяць на захад сонца,
хаваюцца за лесам,
за восенню, за зімой.
А матуля мая
ўсё стаіць на палянцы пасярод неба
з кошыкам спелых суніц,
апошніх у гэтым сезоне.

Тры сны

Мой першы сон
пасівеў, як бацька,
які не пасьпеў пасівець.



Фота www.citydog.by

Мой сон другі здарожыўся,
як дзядуля Іван,
які не хадзіў далёка,
бо на адной назе.

У трэцім сне
я адчула сябе шчаслівай,
хоць не заснула ні на хвіліну.

Сакральнае

Бабуля мясіла гліну.
Матуля ляпіла збан.
А я задрамала ў збане
на самым дне.
Аднойчы прачнуся ў сябе дома.

Ангелу вінаграду

На лева — восень, а на права —
праўда,
Але была і праўда, як залева.
І золак цьмяна ўжо свяціў на дрэва,
Ды дрэва дастаяла да зімы.

Тады сказаў мне ангел вінаграду,
Прыціснуўшыся да вакна шчакою:
— Ты ўжо не будзеш, як раней, такою,
Аднак ляці, кажу табе — жыві!

…І зацвітуць цярновыя званіцы,
Начны туман засвеціцца зарою.
Расправіць плечы валачобнік ніцы
За той апошняй, звонкаю гарою.

У колерах сепіі



Славамір АДАМОВІЧ

* * *

Лістапад, панядзелак, 13-га,
вострa хочацца паваяваць —
да крыві да жалезістай, да аберацыяў
у вачах, якія пакуль глядзяць.
Адчуваю, брат: штохвіліны
ўшчыльняецца
атмасфера водарам H_2S
і надзвычай хутка ў двары змяркаецца,
а ў ружпарку пацецюць ствалы АКС...
Панядзелак чортавы! Хутка восьмая,
ты ізноў з гаўбца недапалкам плюеш,
бо, хоць лоб разьбі, — не здабудзеш
просьбамі
нават самы просты любоўны верш...

Украінскае

...любіць цябе, рыжую-рыжую,
ў зялёнай-зялёнай траве
не дзесьці там пад парыжамі,
а тут, у айчыннай жыве;
любіць, як, здаецца, не люблена
яшчэ ніколі й нідзе,
у жоўта-блакітным лубіне
прыпаўшы да белых грудзей!

На смерць сябра

Калі раптам заўтра паміраць —
я памру шчаслівы і здаровы,
бо, у д'ябла душу тваю маць,
жыў жыццё не дойнаю каровай!
Не карміў з рукі сваім рублём
ні мянтоў, ні попікаў патлатых,
с...ць хацеў на «жоўты дом» з гэб'ём,
кпіў нахабна з чалавечай «ваты»,
«пахана» галоўнага прыбіў
словам да слупа ганебнай славы,
а найболей я жыццё любіў,
як бясконцай вечнасці праяву.
Калі раптам заўтра — не шкада,
неадменны бо закон Прыроды
для мяне, для следчага-вужа,
для суддзі-смаўжа і для віжа,
што сканаў аднойчы ад нажа,
так і не патрапіўшы «на воды»...
Калі раптам... — ведаю, за мной
будуць спадкаемцы новай хвалі
паўставаць, знішчаючы канвой
тых, што нас заўчасна адпявалі!

* * *

Прыгожая, чужая, не мая,
і дзеці не мае ў такой прыгожай.
Чужое ўсё... Шматкроп'е: акрамя
таго, што непрыгожым быць не можа...

Запавет

Час ідзе, і без ніякіх,
блісне момант зноў, тады
не збяёдай, не прагапай
так, як мы, — свае гады!
Вырастай! Крапчэй! Гартуйся!
Маладосць дарма не блэць...
Беларусь сваю згарусціць
трэба ўмець!..

* * *

Без цябе жыву, напяты,
як цымбальная струна...
Спяць у куфры меч і латы,
толькі ты не спіш адна —
Муза дзёрзкага паэта,
песняра вішнёвых руж...
Ты мне рай і цэнтар свету,
цэнтравая ў свеце душ!
Будзь! І буду неўнікнёны
я, спалучаны з табой,
і радок свой пранікнёны
без развагі кіну ў бой!..

* * *

Як тысячатонны атамаход,
прайшла, гайдаючы ватэрлініяй,
і я пацягнуўся за ёю ўброд,
нібы французы на штурм Бастыліі.
Я бачыў, як пеніліся за ёй
вада салоная з аквітай...
Адно і паспеў, што прабулькаць «ой!»,
глыбінным пражэктарам воч прашыты...

* * *

...А сцяг сабе лунае кожны месяц
і хоць штампуй чарговы свой «указ», —
не знішчыць вам, што нашы сэрцы крэсляць
за проста так, а не расейскі газ...

Інтымна-палітычнае

Рыжае-рыжае лета
і зеляніна кантэксту...
Не сонцам — табой сагрэты,
на талент праходжу тэсты.
Ці ўсё я магу? Ці здольны
па-за мяжой узросту
быць і застацца вольным,
адкрытым і злёгку вострым?..
Абы не зламаць раптам
костку рабра Адама
і дажываць экспатам
у роднай Краіне пад хамам!

Зямля народнай памяці...

(Вершы з перыметру Курапат)

«Крок за крокам! Стэп бай стэп!
Спынім будоўлю! Адменім дэкрэт!..
Праўда за намі і сіла, Брат!» —
сказаў мне ўчора з Гомелю сват.
«Харэ баяцца! Дастала, нах..!
Свабода альбо, ці адвечны страх...
Я першую выбраў, са мною давай
Сябе вызваляць і любы наш Край!..».

* * *

Даруйце, пані Проза!
Паэзія ўва мне
у самай зручнай позе
прылегла — на спіне.
Падмахвае імпэтна,
радкі ў радкі кладзе,
метафару-німфетку
падклала кагадзе.
Паверце мне, я мару
заглыбіцца ў раман,
але згушчае хмары
паэзіі падман.
Не выйсці мне з цянёту
рыфмічнае гульні,
як навабранцу з доту
у першы дзень вайны.

Раманс

Ізноў цудоўны зімовы дзень.
Ціха навокал. Падае снег.
За рогам дома пухнаты цень
да плота заснежанага не дабег...
Паленцы сасновыя у агмяні
перастварае у попел агонь,
грэючы цэглу і камяні,
і тваю
маладую
далонь...
Ты выбачай, я так многа любіў...
Што засталося — табе на разбор...
Ды без кахання кім бы я быў?
На халастых часта глохне матор...
Ты мне па ўзросце унучка, і вось
што скажуць маці і бацька твае?
Ты ж ахвяруеш сваю маладосць
хоць і здаровай, ды сталай Літве...
Паабяцай мне — я верай жыву! —
паабяцай, што не кінеш любіць
І Беларусь, і ВялікаЛітву,
і разам са мной будзеш іх бараніць...

* * *

Не пасляваю... Паўсюль шматкроп'і...
І трэба выбраць, што напісаць:
заяўку на грант ці «Цану Еўропы...»,
ці плюнуць на ўсё і пайсці ваяваць...

А, зрэшты, далёка хадзіць не трэба,
вайна ўжо сама прыходзіць да нас...
У гэтым сезоне апошняе дэрбі,
і выйграе той, хто згуляе на пас...

* * *

Межы свае пільнуйма,
не прагнучы выйсці з іх,
каб не накалолі нумар
аднойчы на нас, жывых!..

Чужога ніколі не прагну,
але і свайго не аддам —
нават калі з панагіяй
прыйдзе суседскі хам!..

* * *

Любоўю да Радзімы і Жанчыны
прасякнуты я ўвесь, ніяк інакш,
а калі што — уласным Збройным Чынам
абараню свой палюбоўны стаж!..

* * *

З новым годам! З новым змаганнем!
З новым набыткам і новым каханнем!
З новай надзеяй і поспехам новым!
З позіркам дзёрзкім з-пад чорненькіх
броваў!
Сёстры-землячкі! Браты-суайчыннікі!
Лёс перайначаць нашыя ўчынкі!..

2017, Мар'іна Горка

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 11 (147) | 30 лістапада 2018 | № 44 (607) Новы час

Цягнік пайшоў...



Стася НАРКЕВІЧ



Дарожнае

Дзень абяцаў быць гарачым — ні хмурынкі на небе. І промні сонца ўжо зранку так смалілі, што ад іх нельга было схавацца ні пад разгалістымі шатамі клёнаў, ні ў памяшканнях. Асабліва стала невыносна горача апоўдні.

«Як жа дабрацца да вакзала, няма чым дыхаць?» — падумала, калі апынулася на прыпынку. Зірнула на гадзіннік, на расклад руху транстарту і вырашыла ісці — час дазваляў. Але не гэта стала галоўнай прычынай майго вымушанага падарожжа, а ўчарашнія ўспаміны пра паездку дадому з працы ў бітком набітым аўтобусе, дзе нельга было нармальна паставіць ногі, як і падняць рукі, каб ухапіцца за поручні і трымацца. Хаця ведала, што ісці ў такую спякоту — не цукар есці: духата сціске грудзі, а едкі дым, які выцiскалі машыны, заб'е лёгкія, і на мяне, як, дарэчы, на іншых гараджан, нападзе кашаль — сухі і працяглы.

«У такое надвор'е трэба на беразе рэчкі сядзець ці якога-небудзь вадаёма», — падумала і спынілася насупраць фантана, заглядзелася. Карціна была сапраўды нязвыклая. Некалькі хлопцаў і дзяўчат падставілі гнуткія постаці пад струмені вады і прымалі «душ». Ім хапіла некалькі хвілін, каб вымакнуць да ніткі, а потым з крыкам і смехам выскачыць да сваіх сяброў, якія стаялі збоку і неўпрыкмет прыхінуцца да іх сухога адзення.

— Ну, знайшлі забаву, і дзе? Лепш бы за горад падаліся. Які прыклад падаюць малым, — як старая бабулька, буркнула я. Але раптам схамянулася і адзначыла, што, напэўна, каб і мне было столькі гадкоў, колькі ім, я таксама палезла б у гэты штучны вадаём ды чакала, калі кропелькі вады распусцяць свае нябачныя веееры ды імі адгародзяць ад пякучых промняў шчокі, рукі, галаву.

«Сёння трэба было патэлефанаваць сяброўцы і на яе жоўтай «бубачцы» (так яна называе сваё «Пежо»), паехаць у які-небудзь забыты богам куток да возера і цалюткі дзень лашчыцца ў вадзе,»— мільганула ў галаве. Але гэтага я не магла зрабіць: мяне чакала хворая сястра, якой я везла дэфіцытныя лекі, ды і, у рэшце рэшт, у мяне б не хапіла здароўя зноў стаяць у чарзе па квіток.

Колькі хвілін я яшчэ пастаяла, пераміна́ючыся з нагі на нагу, і хоць дужа не хацела пакідаць «назіральны пункт», але мусіла сябе зварухнуць з месца і пакрочыць да будынка вакзала.

Мне хапіла дзесяць хвілін, каб дайсці да залы чакання, і столькі ж часу, каб трапіць у раз'юшаную плыню пасажыраў, якія, быццам абвараныя кіпенем, уцякалі з памяшкання, у якім не было чым дыхаць: спёртае паветра, перамешанае з гарачынёй, парфумай, пахам ежы, выганяла вонкі.

«Ужо лепш пастаяць на пероне», — падумала і спусцілася ў тунэль. Там хоць было трошкі халадней, але больш небяспечна для здароўя: скразнякі пратыкалі цела.

«І калі ўжо аб'явяць пасадку?» — мільганула ў галаве.

Божа! Нарэшце на табло з'явіўся нумар цягніка і платформы, ля якой ён спыніцца, каб забраць мяне і такіх жа гаротных, як я, што наважыліся ў такі небяспечна душны дзень пакінуць кватэры і ехаць.

Падымаюся па прыступках уверх. Людзей не так багата. Пасажыры з'яўяцца на пероне перад самым адыходам хуткага. Як заўсёды.

А вось і цягнік. Без цяжкасцей знаходжу свой вагон. Прыгожая праваднiца ветліва запрашае зайсці ў яго. Працягваю квіток — і праз некалькі хвілін на месцы. Думаю, хто ж будзе маім суседам ці суседкай. А іх прыйшло двое. «Няўжо ж пасажыры — спарышы?». Не. Муж і жонка. Размаўляюць на ўкраінскай мове. Жанчына сядае ля мяне, муж у наступным купэ шукае месца. Заходзіць яшчэ адна пара, відаць, маладажоны. Ім больш пашанцавала. Дзяўчына і хлопец змогуць прыняць гарызантальнае становішча і з камфортам даехаць да сваёй станцыі. Я за такія ж грошы — амаль што з пакутамі. Ні паклажу схаваць ад людскога вока, ні самой засьніць.

Пакуль разважала, не прыкмеціла, як у наша купэ зайшлі яшчэ два пасажыры — матуля з сынам, якому на выгляд было гадоў з пяць. Жанчыне, відаць, дваццаць пяць-дваццаць сем. Хлопчык такі маленькі, такі худзенькі, што без спачування нельга было глядзець на яго. Апрануты вельмі сціпла. Дарэчы, адзенне ў яго матулі не адпавядала модзе сённяшняга дня: паркалёвая сукенка простага фасону шчыльненька абхоплівала прывабную постаць. На нагах старамодныя чаравічкі і шкарпэткі даўнейшага фасону, якія мы насілі ў 70-х. Светлыя валасы, заплеценыя ў косы, хавала хустка з бацісту — тоненька-таненюсенькая, з някідкім малюнкам па краях. Твар у яе быў белы.

Зірнула я на маладзіцу і падумала, што яна, відаць, ніколі не падмалёўвала вусны, не наносіла румяну на шчокі.

Маці і сын сядзелі ціха. Жанчына пазірала ў акно, малы гуляў з чырвонай машынкай.

Цягнік непрыкметна крануўся і пачаў набіраць хуткасць. Замітусіліся мае спадарожнікі-суседзі: збіраліся палуднаваць. Калі ля жонкі з'явіўся галодны муж, я пажадала «смачна есці» і хуценька ўступіла сваё месца, а сама перасела да маладых.

А што апетыт быў у той пары адмысловы, красамоўна сведчылі прыпасы, якія неўзабаве з'явіліся на сурвэтцы: свежыя агуркі, даволі тоўстыя кавалкі свініны, кружочкі розных каўбас, жоўтыя яйкі. Завяршала сервіроўку пузатая бутэлька віна.

«Як можна такую тлустую ежу ўжываць у такую гарачыню ды яшчэ запіваць моцнымі напоямі?», — падумала і не вельмі ласкава, нават гідліва зірнула на людзей, якія не зважалі ўвагі на нас, а ўплёталі за дзве шчакі прадукты, часам прысмоктваючы. Дарослым было ўсё роўна, хто што рабіў і чым займаўся, толькі хлопчык касіў свае вачаняты на мужа і жонку і праз колькі часу нахіліўся над вухам матулі, гучна сказаўшы:

— Мамачка, я таксама хачу есці. Мы хутка будзем палуднаваць?

— Зараз, Федзечка, зараз, маё сонейка. Я толькі па вадзіцу схаджу, — адказала маці і прыхіліла малога да сябе, пацалавала ў выбеленую сонейкам галаву і ўстала. Падняла рукі да верхняй паліцы і пачала порккацца ў палатнянай торбе. Дастала з яе кубак і накіравалася да купэ праваднікоў. Прынесла кіпень, які выкручваў баранкі пары і на нейкі момант забавіў хлопчыка. Федзька разглядаў пару, а маці збірала на стол харч. Палажыла пяць бульбін у лушпінні, соль у карабку, у якім калісьці былі сярнічкі, некалькі лустачак тонка нарэзанага сыру.

Жанчына ўзяла ў рукі бульбіну і пачала з яе здымаць «адзенне». Рухі яе былі вытанчаныя і дакладныя. Праз некалькі хвілін яна працягнула «распранутыя» клубень сыну. Федзька асцярожна ўзяў у рукі бульбінку і, перш чым адкусіць, пасаліў. Ён вельмі далікатна адкусваў сялянскі дэлікатэс, як і жаваў. І раптам папярхнуўся і закашляў. Матуля працягнула кубак з вадой і папрасіла:

— Цішэй, Федзечка, цішэй. Прагані бульбачку вадзіцаю, мякчэй пойдзе ў страўнік, і сыр вазьмі, трывалей будзе, — сказала і працягнула жоўтую лісцінку сыра. Федзя адкусіў спярша посную сухую бульбіну, потым сыр — і зноў закашляў.

Малы душыўся клубнем, а муж з жонкай — смехам і тлустым жыццём. Я не магла больш назіраць за імі: слёзы пачалі збірацца ў вачах, і, каб не паказаць сваю бездапаможнасць, хуценька паднялася і выйшла ў тамбур. Стаяла доўга, а калі вярнулася да свайго месца, адна жанчына з хітрай усмешкай згортвала крошкі хлеба, другая ж — з суровым тварам збірала лушпінне. Ста́лы мужык сыйшоў у сваю бакавушку, раскінуў ногі, быццам варотцы загарадкі, у якой стаяла свінчо, выкаціў жывот і з задавальненнем захроп. Маленькі ж мужчынка ляжаў на верхняй паліцы, і яго сінія, быццам пралескі, вочкі глядзелі ўверх. Што ён згадваў, пра што марыў — ніхто не ведаў, і ніхто не мог даведацца, бо кожны спадарожнік быў заняты сабою. І я не спытала, не хацела перашкаджаць малому, відаць, лятаць на аблоках. Я толькі пазірала на яго і чакала, калі ён сам пачне гутарку. Не дачакалася. Федзька праз нейкі час падклаў пад шчаку руку, заснуў. Спаў соладка, і па яго вуснах блукала шчаслівая ўсмешка. Мая ж суседка па купэ і яе тоўсты муж праз некалькі прыпынкаў выйшлі з вагона, уступіўшы месца яшчэ аднаму персанажу жыццёвай п'есы — шумнай, крэатыўнай жанчыне, якая неяк неспадзявана з'явілася перада мною і пачала рассыпаць словы, што каласок спелае зерне.

— А навошта вам такі муж? — не вытрымала я, каб не папракнуць. Кіньце — і канцы ў ваду. — Добра казаць... «кіньце!», а каханне? Яно ж як маланка наляцела і запаліла маё нутро. Вы не можаце сабе ўявіць, які мой Сцяпан. Постаць, як у Апалона. Я тут не так даўно хварэла, дык ён мяне, быццам пушынку, падняў і да карэты хуткай дапамогі занёс

— Вы не можаце сабе ўявіць, з якімі цяжкасцямі я здабыла білет на гэты цягнік. Дзякуй міліцыянеру, дапамог. Думала, што сёння не змагу выехаць з горада, з гэтага страшнага горада, — стракатала яна і пазірала на маю рэакцыю. Потым спахапілася і вымавіла:

— Прабачце, я са сваімі праблемамі нават не прывіталася. Даруйце за такую бестактоўнасць. Давайце пазнаёмімся. Клічуць мяне Аксана.

Я таксама назвала сваё імя, але без усялякай ахвоты, больш уважліва зірнула на жанчыну, якая была апранута ў касцюм няйначай як «ад куцюр». Хаця, шчыра кажучы, на ёй і лахманы б сядзелі прыгажэй, чым на брыдкай каралеве самыя дарагія ўборы.

— А вы далёка едзеце? — сядаючы насупраць мяне, спытала яна. Я маўчала.

— А ўсё ж паразіты гэтыя мужыкі, — не ўнімалася маладзіца. — Я столькі вёрст адмахала спярша на папутках, потым аўтобусамі. Прыехала, а мужа не застала. Я так хацела сюрпрызам на яго галаву зваліцца. Не атрымалася. Размінуліся. Я — сюды, а ён — дадому, відаць. Але ж штосьці мне не верыцца, а датэлефанавацца не магу — абанент не адказвае. Нячыста тут. Нячыста! Можа, якую-небудзь маладзіцу завёў ды штоночкі гушкаецца з ёю. Калі гэта так, не здабраваць яму, ой, не здабраваць. Я ж Сцёпачку прыпомню ўсё: і жонак, і каханак, і розныя гулянкі.

— А навошта вам такі муж? — не вытрымала я, каб не папракнуць. Кіньце — і канцы ў ваду.

— Добра казаць... «кіньце!», а каханне? Яно ж як маланка наляцела і запаліла маё нутро. Вы не можаце сабе ўявіць, які мой Сцяпан. Постаць, як у Апалона. Я тут не так даўно хварэла, дык ён мяне, быццам пушынку, падняў і да карэты хуткай дапамогі занёс. Хоць мне і дрэнна было, але я з задавальненнем слухала, калі доктарка гаварыла, што такіх мужыкоў сёння днём з агнём не знойдзеш. А ў вас які муж? — не ўнімалася Аксана.

— Ніякага няма, — схлусіла я і пачала праз аконнае шклоназіраць за хмарамі, якія белымі баранчыкамі бегалі па небе.

— І ў мяне б не было, каб не мая знаходлівасць. Умець трэба абкручваць мужчын. Тыдня мне хапіла, каб Сцяпан ад сваёй жонкі збег.

— Знайшла чым ганарыцца, — перайшоўшы на «ты», папракнула жанчыну. — Разбіла сям'ю. І не сорамна?!

— Якая сям'я? Яны толькі-толькі пажаніліся. Увесь пасёлак ведаў пра іх адносіны і пра яе кавалераў. Лепш адразу разбегчыся, чым з недаверам жыць пад адным дахам. Ці я не так кажу? — засыпала мяне пытаннямі Аксана. — Затое цяпер мы з любым — бы адно цэлае. Вось, заручальны пярсцёнак нядаўна падарыў. Блішчыць, яшчэ як блішчыць! Не магу наглядзецца. Я яму ніколі не здраджу, — клялася Аксана якраз у той момант, калі ля нас спыніўся малады і прыгожы дзяцюк. Нахіліў галаву над вухам маёй расказчыцы і прашаптаў:

— Прыгажуня, а ці ёсць у цябе чым запаліць цыгарэтку?

— Ёсць, вось, — маланкава адрэагавала Аксана і працягнула хлопцу запальнічку.

— Можаце ўзяць, але на нейкі час, а я таксама палю, — з загадкавай усмешкай, якой звычайна хочуць прывабіць да сябе кавалераў, сказала Аксана.

Хлопец узяў патрэбную рэч і накіраваўся ў тамбур. А верная жонка, якая некалькі хвілін таму клялася ў каханні да мужа, пачала скручваць з пальца заручальны пярсцёнак... Але бялюткі кружочак на загарэлай скуры не толькі выкрываў Аксанін падман, але быццам крычаў за яе на ўсё купэ: «Я замужам, я замужам!»

Ды на гэты нямы крык ніхто не зважаў увагі, акрамя мяне, бо ніхто нічога не бачыў. Сляпой ураз зрабілася і Аксана. А мо не хацела бачыць, што ў чалавека ў руцэ была свая запальнічка, а на пальцы правай рукі быў такі ж тоненькі паясок ад заручальнага пярсцёнка.

«Вось і яшчэ з'явіўся адзін герой сённяшняга падарожжа, — чамусьці падумала. — Напэўна, будзе клеіцца да Аксаны. Нездарма ж зняў пярсцёнак».

Я не памылілася. Прыгажун нечакана зноў намаляваўся перад Аксанай, падзякаваў за запальнічку і адразу накінуў на яе сетку, сплеценую з кампліментаў і прыгожых слоў. Потым спахапіўся і, як нядаўна Аксана, папрасіў прабачэння, што забыўся пазнаёміцца. Назваў сябе, спытаў, як клічуць яе.

— Я Аксана. Мая спадарожніца — Тося, — адрапартавала суседка Віктару.

Я маўчала. У мяне ж знікла ўсялякая ахвота падтрымліваць гутарку, і я ўткнула свой твар у часопіс, аднак чытаць не змагла. Байка, якую сцішаным голасам баіў Аксане чалавек, адцягвала ўвагу ад артыкула і пераконвала ў тым, што да нас падсеў балбатун-выдумшчык, а мо і аферыст-бабнік, які праз некалькі хвілін раскажа самую неверагодную выццёўную гісторыю, а можа, папросіць грошай, а нашы імёны запіша ў свой памінальнік ды перад мужчынамі будзе хваліцца, які ён герой-палюбоўнік...

— Аксаначка... Як пачую гэтае імя, мая кроў шпарчэй па жылах бяжыць. А ў скронях звініць, быццам там званочкі. Яны і вяртаюць мяне ў мінулае, да маёй прыгажуні Аксаны. Да маёй любай здрадніцы. Дарэчы, вы так да яе падобная. Такія ж рысы твару, усмешка, ямачкі ў шчоках. А рукі — што ў каралевы, — усё нахвальваў Віктар маю спадарожніцу.

Я адклала ўбок часопіс і зірнула на Аксану. Жанчына свяцілася. Яе танклявыя пальцы хваляваліся, перапляталіся, блыталіся, бы ніткі. Маладзіца не знала, што ёй рабіць і як рэагаваць на кампліменты. Яна вагалася, а Віктар не сціхаў:

— Аксаначка, а чаму вы маўчыце? Вам не цікава, чаму я сваю каханую назваў здрадніцай?

— Чаму ж. Вельмі. І што яна такое зрабіла? Пакрыўдзіла такога прыгажуна, відаць, тым, што пакахала іншага? — спытала жанчына.

— Яна не пакахала, мая Аксанка нарадзіла дзіця. Дзяўчынку. Маленькай ужо восем месяцаў, і па сённяшні дзень так і не прызналася, хто бацька Машы. Усё сцвярджае, што неўмалятка — мая дачушка. Я не памятаю, каб... Я ж амаль круглы год працую ў Расіі.

— Не трэба падазраваць чалавека, не высветліўшы ўсе абставіны, — заўважыла Аксана.



Фота www.from-ua.com

Умець трэба абкручваць мужчын. Тыдня мне хапіла, каб Сцяпан ад сваёй жонкі збег. — Знайшла чым ганарыцца, — перайшоўшы на «ты», папракнула жанчыну. — Разбіла сям'ю. І не сорамна?! — Якая сям'я? Яны толькі-толькі пажаніліся. Увесь пасёлак ведаў пра іх адносіны і пра яе кавалераў

— Вось і высветлю. Толькі грошы вялікія трэба, каб зрабіць аналіз на ДНК. Пяцьсот даляраў, не менш.

— Казалі-мазалі.... Дарэмна будзеце такое рабіць, ой дарэмна, — не стрымалася я, каб не ўставіць свае пяць капеек. — Радуйцеся, што ваша жонка нарадзіла і ў вас ужо сапраўдная сям'я. Не крыўдзіце сваю Аксану. Гэтым учынкам вы перакрэсліце ўсё жывое і каштоўнае. За такі ганебны ўчынак яна можа вас выкінуць не толькі з кватэры, але і з сэрца свайго. А як цяжка жыць у абдымках з адзінотай.

— Я такі гарны хлопец — і буду адзін? Кіньце дурное. У мяне столькі дзяўчат, жанчын. Усе так хочуць пяшчоты, кахання. Яны ж, як смала, ліпнуць. Ды толькі на ўсіх здароўя няма.

— Так ужо і ліпнуць. Вы, мужчыны, перабольшваеце свае магчымасці, — злосна адказала я.

— А хочаце, я вам дакажу. Нават зараз, — і Віктар дастаў з кішэні запісную кніжку. Адкрыў і паднёс яе да маіх вачэй. Прыгожым почыркам былі ўпісаны прозвішчы і імёны жанчын: адрасы, нумары тэлефонаў.

— Ну, што вы на гэта скажаце? — пераможна выгукнуў Віктар.

— А гэта яшчэ не факт, — праз зубы выціснула я. — Пакуль даедзеце да канечнага прыпынку, яшчэ не з адной жанчынай ці дзяўчынай пазнаёміцеся ды іх адрасы наніжаце на шарыкавую ручку. Мне непрыемна нават сядзець ля вас, таварыш плаксівец, а не тое, што слухаць вашу пустую балбатню. Дзякуй богу, што хутка мой прыпынак, — сказала і паднялася. Потым павярнула галаву да Віктара і выпаліла.

— Хіба вы мужык, калі кожнаму стрэчнаму расказваеце пра жанчыну, якая, пэўна ж, кахала і кахае. Навошта?

Я гаварыла, а Віктар маўчаў, быццам вады ў рот набраў. Думаю, ён не чакаў такой развязкі і такім паваротам справы быў збіты з панталыку. Я ж у нейкай ступені засталася задаволеная. Шкада, што ўсё накіпелае не змагла выказаць. Ды і ці трэба было далей псаваць сабе настрой і з кіслым тварам з'явіцца перад сястрой, у якой і без мяне хапае турбот?

Не развітваючыся, я халодна-калюча зірнула на сваіх спадарожнікаў і пакрочыла да выхаду, каб праз колькі хвілін не толькі пакінуць прыкрых мне людзей, але і выкінуць іх са сваёй памяці. Тым больш, што мяне ўжо сустракаў родны горад, дзе кожны ліхтар быццам бы падміргваў жоўтымі вачыма, відаць, радуючыся нашай сустрэчы.

Дзівак з вакзала

Мужчына гадоў сарака, а мо і трошкі больш, шпаркім крокам зайшоў у памяшканне, дзе знаходзіліся прыгарадныя касы. Ён адразу на сябе звярнуў увагу не чыста-сакавітай беларускай мовай і аксамітава-саладкаватым голасам, а хутчэй за ўсё вычварным «касцюмам». Зрэшты, тое, што хавала яго худыя ногі, пакрытыя шчацiннем, якое выгарала пад спякотным для гэтага года сонцам, нельга было назваць адзеннем: падраныя кашулі, а іх было, відаць, штук пяць-шэсць, абхоплівалі сцёгны, вылазілі адна з-пад адной, а іх рукавы, якія былі завязаны на жываце, утваралі гузакі, тырчэлі наперадзе, быццам бы нарывы. Споднягa ў яго не было.

Грудзі з рэбрамі-граблямі хаваліся пад кашуляй, зашпіленай на адзін гузік. Галаву дзівак накрыў анучкай, якая была калісьці, відаць, хусцінкай белага колеру. Каб кавалак матэрыі не зваліўся, чалавек абвязаў яе вяровачкай.

У адной руцэ былі дзве торбачкі з пажыткамі, у другой — кіёчак, на канцы якога матухна-прырода вылепіла нейкага дзіўнага звярка; яго да бляску адшліфавалі ахайныя рукі з доўгімі, быццам у музыкі, пальцамі, якімі дзівак раз-пораз дакранаўся да шчок, ілба. А вось вочы, блакітна-шэрыя, ліхаманкава «стралялі» па жанчынах, якія з цікаўнасцю назіралі за ім. Чалавек гэта адчуў, і таму пачаў актыўней «працаваць» на публіку: чытаць на памяць вершы рускіх і беларускіх класікаў. Рабіў гэта з такім замілаваннем, з такім акцёрскім майстэрствам, пагладжваючы шыкоўную сівую бараду, што можна было толькі пазайздросціць. А то і спяваў, у асноўным песні 80-х, і вельмі добра. Калі адну з іх даспяваў да канца, падышоў да кáсы і працягнуў грошы. Назваў выразна станцыю, на якой меўся выйсці з электрычкі, узяў рэшту і вельмі міла ўсміхнуўся касірцы. І маё падазрэнне, што спадарожнік бомж ці псіхічна хворы, развеялася.

Ад касы да лаўкі пасажыр не ішоў, а з прытупам набліжаўся. Прысеў. Закасаў рукаў і амаль крыкнуў:

— А мяне нават наркотыкі не бяруць. Вось зірніце...

І я зірнула, бо сядзела не вельмі далёка ад незнаёмца. На жылістай руцэ не было слядоў ад уколаў.

«І навошта на сябе такое нагаворваць, — падумала. — Лепш далей бы спяваў ды тымі спевамі вяртаў у юнацкія гады». Але чалавек больш не зацягваў рамансы, а пачаў абурацца на сваіх суайчыннікаў, якія не любяць беларускую мову, не хочуць на ёй размаўляць, як і не ведаюць сваіх караней. А як ён усхваляў жанчын (напэўна, што ў памяшканні былі адны кабеты)! Мужчына гаварыў, што жанчыны яго абагаўляюць, узносяць, узбагачаюць, бо ў іх найтанчэйшыя душы і добрыя сэрцы.

Амаль гадзіну мы вывучалі яго паводзіны, назіралі тонкую гульню акцёра.

«Толькі навошта ён ломіць камедыю», — міжволі прабегла думка. — Навошта? Мабыць, ужываецца ў новую ролю. Трэба зрабіць на памяць фотаздымак». І, гледзячы яму ў вочы, пачала расшпільваць сумку, каб дастаць фотаапарат. Не паспела зрабіць і рух, як чалавек падхапіўся і на ўсю залу крыкнуў: «Папарацы!»

— Ага, значыць, ты не дурны, калі ведаеш, што такое папарацы, — ціха сказала. Але крык усё ж спыніў мяне, а намеры прымусілі пасажыра больш пільна пазіраць у мой бок і глядзець — вочы ў вочы. Напэўна, ад такога пільнага погляду мяне разабраў смех, які так і рассыпаўся, што пясок-цукар па падлозе, раствараўся ад гарачыні і салодкім водарам напаўняў памяшканне. Думаю, смяшынак нахапаўся і наш дзівак, які стварыў вобраз дурня і, як малое дзіця, стаў яшчэ актыўней весяліць публіку. Пацешыўшы пасажыраў (але як мне здалося — больш сябе), ён пакінуў залу. Перш чым зачыніць дзверы, "акцёр" шматзначна зірнуў на мяне, быццам спытаў:

«Ну, як я табе?».

Замест адказу я ўсміхнулася. А праз некалькі хвілін таксама накіравалася да выхаду — аб'явілі пасадку. Да вагона ішла марудна, і раптам адчула чыйсьці позірк. Азірнулася. Мяне свідравалі вясёлыя вочы нядаўняга суседа па лаўцы. І я пачула:

— Мо вам дапамагчы? Тады пачакайце. Я падыду і ўскулю ваш хатуль у электрычку.

— Дзякую. Не трэба. Сумка ў мяне лёгкая, хоць з выгляду груваская, — строга адказала і пакрочыла далей. Падышла да вагона, падняла сваю паклажу і паставіла спярша на адну, потым на другую прыступку.

— Аднак вы ганарлівая і дужая жанчына, — пачулася збоку, — але ж і нейкая дзіўная: адмовілася ад дапамогі.

Я прамаўчала, толькі падумала: «Цікава, хто з нас большы дзівак...». Хоць праз некалькі хвілін пашкадавала, што адмовілася ад дапамогі чалавека, які такім чынам хацеў наладзіць кантакт. І я б даведалася пра яго... Тым больш, што спадарожнік уладкаваўся ў вагоне, у якім была і я. Ды толькі было позна.

Як кажуць, цягнік адышоў...

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 11 (147) | 30 лістапада 2018 | № 44 (607) Новы ЧАС



Родны кут — свячоная радзіма



Мікола ГІЛЬ

* * *

Тры дубы над лецішчам маім,
Корань тут пусцілі з маіх рук.
Два сыны — Мікола і Максім,
Трэці Ян — адзіны мой унук.

Часам аж не верыцца мне ўжо,
Што пасаджаны калісьці мной:
Голле развінулі на ўсе сто,
Неба падпіраюць галавой!

Сведкі хуткаплыннасці яны
Часу, што імчыць, бы сам не свой:
Вунь — сівыя мужыкі сыны,
Ды і ўнук — даўно не хлопчык-бой.

Выйду ў сад — шумяць мае дубы,
Шырака раскінуўшы шацёр.
Хай ідуць, імчаць, ляцяць гады —
Будуць сведчыць: я яшчэ не ўмёр!

11.02.2018

* * *

Памніцца, канечне, і благое,
Добрае, аднак, усё-ткі лепш.
Штосьці добрае, амаль святое,
Просіцца з душы й цяпер у верш.
Ну а што яно, дык і не знаю,
Толькі адчуваю ўсім нутром,
Як мяне маркота пакідае,
Як вакол святлее ўсё суздром…

12.02.2018

* * *

Чуюць, чуюць вароны вясну,
Мітусяцца — шукаюць пару,
Зразумела тут і няздару —
Чуюць, чуюць вароны вясну!
Карацее ноч — час ахвяраў,
Мкне жывое насустрач дню, —
Чуюць, чуюць вароны вясну,
Мітусяцца — шукаюць пару…

* * *

Нудзяцца доўгай зімой бабулі
У клетках сынавых усіх Чыжовак, —
Жывуць чаканнем клапот вясновых
У вырай гнаныя птушкі-бабулі.
Колькі джоўляў нэндзы крыжовай
За час зімовы скукуюць зязюлі?
Нудзяцца доўгай зімой бабулі
У клетках сынавых усіх
Чыжовак…

13.02.2018

* * *

Каго ні ўспомню, каго ні згадаю,
Няма ні першага, ні другога
З часу шчаслівага, маладога, —
Каго ні ўспомню, каго ні згадаю.
Вось боль і горыч жыцця старога:
Вакол — пустэча, без меж, без краю, —
Каго ні ўспомню, каго ні згадаю —
Няма ні першага, ні другога.

* * *

Амаль раслінным я жыву жыццём —
Паем ды і сяджу, бы ў задуменні,
Мяне ўжо не бярэ і недаўменне,
Што вось жыву раслінным я жыццём.
І не відаць ніякага збавення —
Дыктуе гэткі лёс само быццё.
Амаль раслінным я жыву жыццём —
Паем ды і сяджу, бы ў задуменні…

14.02.2018

* * *

Каторы дзень ідзе-гудзе гульня
Па ўсёй краіне — выбары ў саветы…
Ніхто не бачыць сэнсу ў ёй і мэты,
Ды ўсё ж ідзе-гудзе ва-ўсю гульня!
Таўчэцца зноўку фарс-спектакаль гэты,
Каб спрэс была стабільнасць, цішыня, —
Каторы дзень ідзе-гудзе гульня
Па ўсёй краіне — выбары ў саветы…

15.02.2018

* * *

Родны кут — свячоная радзіма,
Грэх яго радзімай зваць малой.
Матчынна-бацькоўскі, помны, свой
Родны кут — свячоная радзіма!
Ён не нейчы і не ўсіхны — твой,
У цалюткім свеце ён — адзіны,
Родны кут — свячоная радзіма,
Грэх яго радзімай зваць малой!

17.02.2018

* * *

Жыву я, бы ў чужой краіне:
Свайго — ні гуку, ніадкуль.
Адсюль чужое і адтуль —
Жыву я, бы ў чужой краіне.
Нянаскае гучыць паўсюль, —
І хоць бы знак, што з часам знікне,
І ўжо душа ў адчаі нікне, —
Свайго — ні гуку, ніадкуль…

25.02.2018

* * *

Цьмы цьмушчыя канулі ў лету,
Ды нямногіх зберагла памяць
Праз нялічаных годаў замець, —
Цьмы цьмушчыя канулі ў лету.
Горка мне і вусцішна цяміць,
Што не будзе і па мне следу…
Цьмы цьмушчыя канулі ў лету,
Ды нямногіх зберагла памяць.

26.02.2018

* * *

Вясне — усё жывое рада.
Усё ірвецца да жыцця
Са сну паўстаўшы, з небыцця, —
Вясне — усё жывое рада!
Прыроды й чалавек дзіця,
І ўдзельнік весняга параду, —
Вясне — усё жывое рада,
Усё ірвецца да жыцця!

1.03.2018

* * *

Вясна, і ты ўжо мала цешыш —
Жаданні згулухлі, згаслі мроі,
Штодня ў мінорным я настроі, —
Вясна, і ты ўжо мала цешыш.
Бяда душу і сэрца кроіць,
Але каму іх разнасцежыш?..
Вясна, і ты ўжо мала цешыш —
Жаданні згулухлі, згаслі мроі.

7.03.2018

* * *

Старыя фільмы — сведкі прошласці,
Глядзець іх сумна і — цікава.
Не ўбогія кіназабавы
Старыя фільмы — сведкі прошласці.
Жыцця рэальнага праявы,
Дзе было шмат хлусні і жорсткасці,
Старыя фільмы — сведкі прошласці, —
Глядзець іх сумна і — цікава.

9.03.2018

* * *

Не сны ўначы — адны кашмары,
Хоць тут наогул не лягай,
Ад ложка мулкага ўцякай, —
Не сны ўначы — адны кашмары.
Сцяной каменнай — небакрай,
Свінцом атрутным — зверху хмары,
І ўдзень не ява — спрэс кашмары, —
Хоць ты сябе жыўцом хавай.

10.03.2018

* * *

Чым больш жыву, тым больш сумненняў
Адносна вартасці жыцця:
Усе рэаліі быцця
Крычаць аб марнасці імгненняў!
Даляр — паходня развіцця,
Прагрэс — шлях да самазнішчэння,
Сама Зямля нэкст пакаленням
Ці будзе здатна для жыцця?

19.03.2018

* * *

І хоць усё яшчэ марозік
Начамі цісне (больш па звычцы),
Ды сонца ўжо — на летняй вышцы:
Ў калясцы грэецца курносік!
Я сонцу, нібы добрай кніжцы,
Таксама рады — жывіць крозы,
Хаця усё яшчэ марозік
Начамі цісне (больш па звычцы)…

20.03.2018

* * *

Чые ўзяў гены, чалавеча,
Такім і твой складзецца лёс,
І калі чымсь цябе абнёс,
Дык не шукай віны ў тым нечай.
Я й не шукаю, бо наўпрост
Мне бацькаў лёс-нядоля сведчыць:
Чые ўзяў гены, чалавеча,
Такім і твой складзецца лёс.

* * *

Ах, людзі, вас вакол — мільёны,
І быццам розныя ўсе вельмі, —
Чаму ж між вас так многа шэльмаў
І толькі рэдка хто — анёлы?
Няшмат ахвотных узяць кельмы
І будаваць наш дом саснёны,
Які ахоўвалі б анёлы, —
Мо ўсё-ткі меней было б шэльмаў?

23.03.2018

* * *

Калісьці белага ваўка
Пабачыў я між зграі шэрых…
Сягоння згадка апякла, —
Шкада чамусь мне стала звера:
Ён пачуваўся між сваіх
Бадай, чужым, мо і самотным…
Не між сваіх, а між чужых
Жыву выгнанцам я маркотным…

24.03.2018

* * *

Дзянёк «святы яшчэ ад рання»…
О так, святы! Сто год прабегла
З Дня нараджэння, з Дня світання,
З Дня, Беларусь калі ўваскрэсла!
Выходжу. Двор — у сонца бляску,
Ды без святочнага гамону,
Ёсць чорны шэраг аўтазакаў,
Ёсць шчыльныя шыхты АМОНу…

25.03.2018

* * *

Народ, адкуль тваё праклясце
І доля — знікнуць з мапы свету?
Ні Касінера, ні Паэта
Не ўчуў — к табе не дагукацца!
Ты, зрокшыся высокай мэты
Паўстаць народам, людзьмі звацца, —
Навёў сам на сябе праклясце
І выбраў долю — кануць ў Лету…

26.03.2018

* * *

«Сынок, ніколі не хвалі сябе!
Няхай цябе пахваляць людзі!»
Я так і жыў — у свята й будзень:
«Сынок, ніколі не хвалі сябе!»
Гады ж — без подкупу спрэс суддзі! —
Ішлі ў дакорах больш, чым пахвальбе,
Але я помніў: «Не хвалі сябе!
Няхай цябе пахваляць людзі!»

2.04.2018

«Паставіў клічнік...»

(Студэнцкае пісьмо Алега Лойкі 1949 года)



Пісьменнік, перакладчык, літаратуразнавец, доктар філалагічных навук, прафесар, член-карэспандэнт Нацыянальнай Акадэміі Навук Алег Лойка (1931–2008) быў родам са Слоніма. Там прайшло яго маленства, там ён і дажываў свае апошнія гады ў доме на Віленскай вуліцы.

Восенню 1948 года Алег Лойка паступіў на філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта. Гэта былі пасляваенныя няпростыя гады. Але гэта быў і час самага шырокага наплыву ў інстытуты Мінска моладзі з былой Заходняй Беларусі. Менавіта студэнцкія гады, інтэрнат упершыню прымусілі юнака з заходнебеларускага горада Слоніма сур'ёзна задумацца над жыццём, над стаўленнем да чалавека, да свайго часу.

Алег Лойка пачаў пісаць вершы са школы. Першыя паэтычныя творы з'явіліся ў 1943 годзе ў «Баранавіцкай газэце». Спрабаваў ён іх пісаць і ў студэнцкія гады, але без вялікага поспеху. Сяды-тады заходзіў пачатковец у рэдакцыі газет і часопісаў. І хоць не друкаваўся, але непрыкметна набіраўся пэўнага вопыту, дзякуючы перш за ўсё шчырым, клапатлівым адносінам літаратараў Міколы Аўрамчыка і Сяргея Дзяргая. А ў 1959 годзе слонімец выдае свой першы паэтычны зборнік «На юначым шляху».

Родная сястра Алега Лойкі Людміла Антонаўна Клімовіч, якая жыве ў Слоніме на Зялёнай вуліцы, пазнаёміла мяне з адным з першых студэнцкіх пісьмаў Алега Лойкі, датаваным 27 лютага 1949 года. Юнак толькі тры тыдні адвучыўся ў Мінску. І напісаў бацькам у Слонім свой першы ліст. Пачытаем яго. Пісьмо пачынаецца з верша:

Добры дзень, каханыя,
Хата пажаданая,
Хлеўчыкі, садок —
Ўсё! Нат халадок,
Што царыць ля печкі
І не грэе плечкі
Ні маме, ні Люсі,
І сягоння мусіць!
Жыў, здароў, і Вам чаго
Арганізм жадае мой,
Ўсім прывеы да таго
Я кладу сюды ў пісьмо,
Плюс шчэ пацалункі
Шлю пісьма я клункам
Вам усім, каханыя!
Далей прозаю пішу,
Бо сказаць кой-што спяшу,
А іменна...

Далей юнак са Слоніма апісвае сваё студэнцкае жыццё, як ён кажа, прозаю. А піша ён з гумарам; быў, відаць, у добрым настроі. Вось што ён піша: «Тры тыдні прайшлі, як я тут. Ніякіх цяжкасцей няма. Усё — норма. Стыпендыю — ура! — атрымаў! І... павышаную. Вылічылі за інтэрнат 90 руб. і яшчэ там на нейкія дробязі, і на рукі атрымаў 257 руб. Так што грашыма забяспечаны да новай стыпендыі. Сёння ў мяне на руках 200 руб. з капейкамі, за тое забяспечыў сябе ўсім неабходным і купіў аўтаручку, ножык, шчотку, гуталін да ботаў, шнуркі, сшыткаў, паштовак... Ну і яшчэ тое-сёе, успамінаю. Хлеб купляў, купляў лапшу, варыў. Сёння, як яго... кхкхкх... не магу ўспомніць... ну... гэтага... а! Балерона — наканец успомніў — прыкончыў: засталіся рожкі ды ножкі! Цыбуля, як гэта кажуць, канула ў ваду, але не ў ваду. А ў нешта больш паважнае, благачасцівае, вазвышанае — у гэтае, значыць, маё, так сказаць, хайло, а па-медыцынску — поласць рота, глотка, стрававец, кішэчнік, дванаццаціперсную... баюся пераблічваць, бо яшчэ дабярexternal... кропка! (А паставіў клічнік — от махляр!) І так, капут балерррон (а смачны быў, ей Богу, капут і цыбуля). І сала ўжо мала. Хопіць да канца гэтага тыдня. На пасылку не спадзяюся. Думаю, сам глянуць праз тыдзень-другі дахаты за падсілкаваннем. Мама! Вы мне прыгатуйце альбо кг масла, альбо шмальцу. Больш не трэба. Апошняе — здагадаецеся і ведаеце лепш самі мяне. Мука ў мяне яшчэ ёсць — палавіна ўзятай. Зубы свае балючыя я вылечыў, ляжаць «пробныя» пломбы, на днях угняздзяцца і сапраўдныя. Штаны ў мяне — красата, любата, захапленне, і канты яшчэ трымаюцца, во! Што ж яшчэ?! Ну, сёння я дзяжурны ў пакоі, і парадак добранькі. Наогул, усё ідзе добранька. Вам жадаю і, кахаючым Вас, застаюся — Алег.

Шлю табе, Люсёнак (маецца на ўвазе сястра Алега Лойкі Людміла. — С. Ч.), паштоўку. Напішы. Ці спадабалася і яшчэ што-небудзь. Прывет! Прывет! Прывет! Пацалункі! Лёлек-студэнт».

...Вось такі быў першы ліст студэнта Алега Лойкі ў Слонім да бацькоў. Ён вельмі добра адлюстроўвае той пасляваенны час, калі некаму пашанцавала быць студэнтамі.

Сяргей Чыгрын

Беларусі купель

Алег ЛОЙКА

Беларускае

Беларусь дарагая —
Прожылкі сцяжын,
Гасцінец да небакраю
Дзівасілу, ажын,

Чырвань ружаў балючых,
Свойскіх палотнаў бель,
Шэпт крыніц неўміручых —
Беларусі купель.

Бароў векуістых пагоркі,
Сплаканых бяроз,
На вуснах — прысмак горкі
Ад неўміручых слёз,

Вясельны блакіт у келіхах
Ледніковых азёр,
І заклёны ад ліха
Пад дрыжаннем зор,

Маладзікі і ветах,
Млечнага Шляху кайма
І канец свету,
Канца якому няма.

Пра шчырасць і смеласць

Шчыры заўсёды смелы.
Ул. Рубанаў

Слову ляцець у вырай,
(Твар стаў бялей мелу), —
Я — смелы, бо я — шчыры,
Я шчыры, бо я — смелы.

Шчыры, ці спёка ці лівень,
Як мова наша і песня,
Шчаслівы ці нешчаслівы,
Я — хлеб-соль каля весніц;

Самотны ці на трыбуне,
Гарэзлівы ці смутны,
Ці крыўда сэрца струніць,
Ці вір цягне каламутны,
Ці ў невымоўным горы,
Ці ў маўклівай слязіне,
Пакорны ці ў непакоры,
Я шчыры пад небам сінім.

Ды толькі... О, Божа, о, Неба,
Дзе, над якім йшчэ вірам
Быць вельмі смелым трэба,
Каб мілаваць край свой шчыра?!.

***

Нам не забыцца таго,
Нам не пазбыцца таго
З-пад чырвоных сцягоў
Без святых і Багоў.

Вось яно і вісіць
Над беднаю галавой
Пра нешта не марыць, не сніць,
Мне шэрых дзён сувой,

Запыняе рух,
Натхнення, сіл не стае:
Мінулага прах і пух
Уваскрасаць не дае.

***

Я ў бітвах не забіты,
Не сню я саракі,
Я — валуном забытым
Ля бурнае ракі.

Ёй плыні не мучу я
Ні поўднем, ні ўначы,
Імшэючы, маўчу я,
Маўчу, нібы сплючы.

Ды чую, хоць каменны,
Ды бачу: віры, та́мы,
Вадаспады ў пене,
Рык хваляў самы, самы,

Ды я зусім не ў скрусе,
І не ў жалобнай раме, —
Яшчэ я заіскруся,
Бо не без іскраў камень!..

Наўзбоч, небыліцы!..

Наўзбоч, небыліцы
Ілжы і лухты!
О, маці-сталіцу
Ўважце, браты!
З бальзамаў крывавы
Хай чорны дасхне
Ў праклятай дзяржавы
Брацкай труне.

І хопіць прастору
Яму між магіл
Ахвяраў тэрору,
Што быў яму міл.

Досць слепнуць, маліцца,
Нібыта краты;
Маўзалей — не капліца,
Ён — не святы.

Такое ж — не позна
Між родных сцягоў:
Расіі бярозы
Мо ждуць і яго,

Хай і зажурыцца
Крыж каля труны,
Даруе зямліца,
Адзводзяць званы.

Сябрам

Адкуль вы, непагадзь, беды,
Завыванні вятроў?..
Я не магу без бяседы,
Я не магу без сяброў!..

Мне вятрыска — не сябар,
Не сяброўка слата,
Піліпаўкі чорны табар,
Цемрадзі глухата, —

Не ім жа мая сасонка
Цягне галінкі страсе,
Чакаючы гамонкі
Аб праўдзе, любові, красе,

І, быццам рукою, здыме
Непагадзяў кілім,
Прагная долі Радзіме,
Свету ўсяму і ўсім...

Дык дзе ж вы, сябры-непаседы
З блізкіх і дальніх бароў?..
Цяжка мне без бяседаў,
Пакутліва без сяброў!..

Даражэюць тэлефоны...

Свет няўмольна прэ ў адхоны —
Нівы, сенажаць, лясы, —
Даражэюць тэлефоны,
Даражэюць галасы,

Ды не выбарчыя, — маці,
Што не толькі сцеле лён,
А ў аграрнадумнай хаце
Абнавіла тэлефон.

Са сталічнаю дачкою
Гаварыць ёй, гаварыць,
Толькі ж... На́ табе такое —
Белым полымем гарыць:

Здаражэў званок дашчэнту...
І каго, за што вініць?..
Дарагому прэзідэнту
Трэба, трэба пазваніць!..

Шарае прагну гадзіны...

Прагну не жартаў і глуму,
Можа, такі ўжо адзіны,
Брату, і свату, і куму
Шарае прагну гадзіны:

Цішыні кутавое
Дзедавай мілай хаты,
Вечару, што ў сувоі
Песняў, і казак багаты.

Чым распачаць вячэру,
У дзеда я не пытаю,
Думцы яго веру,
Кленічаў не вітаю,

Аднак жа гатовы і хорам,
І шарай гадзіны вечам
Рэкламаў ілжу і сорам
Усіх вакзалаў развенчваць!..

Адступіцеся, цары і каралі!..

«Толькі закаханы мае права называцца чалавекам».
Аляксандр Блок

Адступіцеся, цары і каралі,
Прынцы, князі, фюрэры і ханы, —
Чалавекам на бязлюднае зямлі
Можа быць адно, хто закаханы!..

Жаль, не я прамовіў гэта, Блок,
Ды яговым эпігонам быць я згодзен
Між маланкавых, грымотлівых аблок
І між мудрасці, што тоіцца
ў народзе,

Бо на свеце ні зубром, ні матыльком
Быць ніколі не жадаў я, не жадаю
І глынаю найгарчэйшы ком,
Калі лёс мяне ў нянавісць закідае,

Згубнай — ёй Шлях Млечны не любіць,
Не ўслаўляць натхнёныя сакрэты, —
Закаханым чалавекам быць мне, быць,
Як былі дагэтуль ўсе паэты!..

Пошук незвычайнага ў звычайным

(Малая проза Сяргея Рублеўскага)

Проза віцебскага літаратара Сяргея Рублеўскага — з'ява адметная, шматстайная, рознажанравая, яна даўно ўжо выйшла за рэгіянальныя граніцы, вызначаецца сваёй філасофіяй, актыўнымі наватарскімі пошукамі, арганічна ўліваецца ў сучасны літаратурны працэс і дапаўняе яго.


Фота www.livelib.ru

Першая кніга пісьменніка мела назву «Апостраф» (тэксты аб праявах быцця). Апостраф — надрадковы знак у выглядзе коскі, які ў беларускай мове аналагічны цвёрдаму і мяккаму знакам у рускай мове. Сам аўтар патлумачыў назву кнігі ў творы, змешчаным напрыканцы пад аналагічнай назвай. «Апостраф — беларуская паўза ў сусветным Логасе», «Апостраф — імгненне паміж уздыхам і выдыхам, час, які, як мушка ў бурштыне, застыў паміж ваганнямі ківача». Сапраўды, апостраф — гэта паўза, невялікі перапынак, што дае магчымасць спыніць рух, азірнуцца назад, больш пільна ўгледзецца ў звыклае і, на першы погляд, добра знаёмае, над чымсьці задумацца і паразважаць. Гэта своеасаблівы позірк на жыццё, аб'ектыўны пункт гледжання. Змест кнігі цалкам адпавядае арыгінальнай назве.

Зборнік складаецца, у асноўным, з невялікіх твораў, якія можна вызначыць як лірычныя мініяцюры ці абразкі на патрыятычную тэму («Мамін шэпт пад абразамі»). Некаторыя больш упадабляюцца навеле («Сляпыя словы пра незваротна страчаны і нанова абяцаны рай», «Час засмактаў...»). У кожным творы, у кожным радку праступае новы погляд на стары свет, адчуваецца аўтарскае светабачанне і ўласная філасофія.

Арыгінальнай назвай вызначаецца і наступная кніга празаіка — «Азярод». Атрымаўся багаты рознакаляровы плот з цікавымі апавяданнямі («Амар», «Хірургі»), дакладнымі назіраннямі («Хукі, як хоку», «Жвысь»), біяграфічнымі нататкамі («Чысціня ў чырвоным куце і ў кожным куточку душы») і трапнымі афарызмамі («Жменя самасейнай цыбулі»). Пісьменік закранае ў зборніку тэмы Вялікай Айчыннай вайны, развіцця культуры і адукацыі, светлага пачуцця кахання, стасункаў чалавека і прыроды.

Назву трэцяй кнігі «Абмытыя валуны» патлумачыў сам аўтар: «Абмытыя валуны — гэта тыя, што ляжаць у рацэ, — восенню ападае ў небыццё, як аджылы ліст... Усё адно ж верыцца, што на самай быстрыні, на самай сярэдзіне наравістай плыні часу ты, не раўнуючы як той тапелец, ухопішся за саломінку вечнасці». Кніга з'яўляецца грунтоўным працягам дзвюх папярэдніх, складаецца з адной аповесці «Спавядальныя дні ў чужым горадзе», апавяданняў з цыклу «Замовы з вучнёўскага сшытка», эсэ «Піва», «Крэсла» і іншых, дзённікаў «З мамай», «Уроссып».

Адны творы ўражваюць сваёй складанасцю, нават незразумеласцю пры абмалёўцы зусім звычайных рэчаў і з'яў, іншыя — наадварот — шчырасцю і ўвагай да дэталяў. У сваіх літаратурных працах пісьменнік імкнецца раскрыць сапраўдную існасць душы беларуса, вылучыць філасофскую складніцу разнастайных праяваў чалавечага быцця.

Важнае месца ў творчай спадчыне С. Рублеўскага займаюць апавяданні, прысвечаныя розным падзеям з жыцця знаёмых і незнаёмых людзей. У іх адчуваецца і замілаванасць маленькай радзімай, і шчырыя сыноўнія пачуцці да маці і ўсіх вясковых жанчын, і цікавасць да актуальных пытанняў сучаснасці. Як правіла, арыгінальныя па змесце творы маюць нескладаны займальны сюжэт («Амар», «Два качагары», «Чорны дым у белы свет», «Ма бі-бі», «Дванаццатая ноч у Рэйнсбруку», «Смачныя цмочкі», «Смерць Ёселя»).

Нягледзячы на тое, што аўтар прыйшоў у літаратуру як паэт, замалёўкі, апавяданні, мініяцюры, эсэ з асаблівасцямі дзённікавых запісаў сталі сапраўднай вяршыняй яго творчасці. Асаблівай увагі заслугоўваюць дзённікавыя запісы аўтара («З мамай», «Уроссып» і іншыя).

Звяртае на сябе ўвагу і аўтарскі стыль: дакладнасць, дасканаласць, паэтычнасць, майстэрства мастацкай дэталі, багацце вобразнай мовы. Усё гэта дазваляе сцвярджаць, што творчасць віцебскага празаіка мае шмат агульнага са спадчынай класіка беларускай літаратуры Янкі Брыля. Абодва — лірыкі па спосабе адлюстравання рэчаіснасці, манеры пісьма; у іх творах выразна выяўляюцца адметнасці асобы, рэчы, з'явы, раскрываюцца індывідуальныя характары. Падобныя нават па назве зборнік мініяцюр Янкі Брыля «Жменя сонечных промняў» і літаратурныя запісы С. Рублеўскага «Жменя самасейнай цыбулі»...

Сяргей Рублеўскі творча самарэалізаваўся ў жанры малой прозы. Для яго самабытнага таленту характэрны асаблівая назіральнасць, вытанчанасць успрыняцця, эмацыянальная чуйнасць, увага да тонкіх зрухаў чалавечага быцця, інтэлектуальна-стылёвая далікатнасць, асацыятыўнасць мастацкага мыслення. Заслугоўвае ўвагі і мова твораў празаіка: каларытная, жывая, якая ўяўляе сінтэз уласна беларускай, іншамоўнай, нейтральнай і стылістычна абмежаванай лексікі. А самае галоўнае — празаік з'яўляецца выдатным знаўцам чалавечай душы, каларытным мастаком нашага звычайнага і незвычайнага жыцця.

Ірына Саматой

Што застанецца, калі аддаць усё

Абвяшчэнне наступнага прыпынку — гэта тое, з чаго пачынаецца раніца шарагоага мінака.

...Паэтычная кніга Алеся Замкоўскага «Наступны прыпынак» (выдавецкая серыя Саюза беларускіх пісьменнікаў) прымусіць чытача згадваць імя аўтара штораз, калі лагодны мужчынскі голас прамовіць на роднай мове: «Асцярожна, дзверы зачыняюцца. Наступны прыпынак...»

Таму назва зборніка — адназначна ўдалы ход. Шкада, што аўтар не быў паслядоўным у структураванні кнігі: у пачатку змясціў раздзел «У залатым акне» з рамантычна-ўзнёслымі, а часам нават празмерна сентыментальнымі вершамі пра каханне:

Агонь тваёй пяшчотнае тугі
люструецца у возеры глінтвейну...

Многіх гэтыя вершы будуць раздражняць. Але гэта падманлівае ўражанне пра паэтычны стыль А. Замкоўскага: найлепшае акурат у наступных раздзелах «Скрозь бездань сну», «Між глухіх сцяжын», дзе паэтычныя радкі — без пафаснай тэатральна-пастановачнай асады.

У першай частцы герой сумленна праходзіць усе «колы амуравага пекла»: закаханасць, недасяжнасць мары, прызнанне, фізічная блізкасць, вера ў светлую будучыню, горыч расстання... Кожнаму адценню пачуцця прысвечаны некалькі вершаў.

Калі ў некаторых радках можна ўбачыць «прывітанне» ад Адама Глобуса («не расказвай пра гэта / нават тату»), то ў творах з наступных раздзелаў — алюзію на Васіля Быкава («толькі пясок / жоўты пясочак са смакам шэрага попелу»). Аднак найбольш выразна ўсё ж чуем нарэшце голас А. Замкоўскага.

Аўтар прапануе герою (самому сабе, чытачу):

выцягні ўсё
што было ў табе
выцягні
і аддай
...аддай
калі ёсць чым усё гэта замяніць

«Гэта» складаецца з аскепкаў будзённасці, ад якіх чалавек так заўзята ў пошуках прасвятлення імкнецца пазбавіцца, як ад лішняга цяжару, але без якога насамрэч папросту не існуе. Калі А. Замкоўскі прамаўляе свае вершы не як драматычны акцёр з відавочным разлікам на ўхвальныя воплескі залы, а як паэт, што заўсёды сам-насам — і з часам, і з горадам, і з каханнем, і з радзімай, калі ён ідзе за вобразам, тэмай, гучаннем, а не выбірае тэму ў якасці хатняга задання, мы бачым адметнае, непаўторнае ўсведамленне рэчаіснасці.


У самых цікавых вершах няма шчымлівых інтымных нотак, затое нашмат больш сапраўднасці. Шматзначныя сімвалы рэчаіснасці, горад з безаблічнымі атрыбутамі пазнавальнасці (бо пазнаем мы найперш не геаграфію, а сябе), штодзённая мітусня, у якой мы губляемся (бо як бы ні імкнуліся «слухаць вечнасць», усё адно «чуем выключна сябе»)...

Алесь Замкоўскі сапраўды чуе першасны сэнс сцёртых метафар, і ўводзячы іх у паэтычны кантэкст, вяртае нам нашу штодзённасць.

Жана Капуста

Восеньскія фарбы зямных эцюдаў

Да 70-годдзя паэта і выкладчыка Віктара Яраца ў кніжнай серыі Саюза беларускіх пісьменнікаў выйшаў яго новы зборнік «Зямныя эцюды».



Паэтычнае пытанне Віктара Яраца «Калі пачынаецца восень — / вада ці старэе рачная?» правакуе на адно, менш узнёслае, больш зямное: калі надыходзіць сталасць, ці старэюць вершы? Ці можна вызначыць узрост пісьменніка па тэме, стылі, лексіцы, як вызначаюць па знешніх прыкметах надыход восені?

Вершы ў кнізе лірыкі В. Яраца «Зямныя эцюды» сугучныя настальгічна-тужлівым восеньскім настроям. Самы час прыпыніцца пасярод штодзённай мітусні і разгледзець не толькі класічныя лістападаўскія фарбы, але і адшукаць у памяці важнае — насуперак падманліва-выпадковаму. Нібы праз партрэтную галерэю, паэт вядзе чытача калідорамі памяці ў раздзеле «Воблікі вёрстаў», дзе змешчаны літаратурныя прысвячэнні А. Разанаву, С. Алексіевіч, Г. Бураўкіну, Р. Барадуліну, А. Вярцінскаму, А. Жуку, Н. Гілевічу...

Праўда, заўсёды ёсць тыя, згадкі пра каго не патрабуюць адмысловай нагоды — тыя, з кім мы ніколі не развітваемся, што б нас ні раздзяляла: гады, эмоцыі, абставіны ці... смерць. Для галоўнага героя кнігі «Зямныя эцюды» гэта каханая і маці. У вершах, прысвечаных ім, ужо не скруха першых дзён страты, а глыбокая, нязменная ў сваёй безвыходнай туга, перададзеная з такой пранiклівай шчырасцю, што кожны радок чытаецца як водгалас болю.

Родныя, якіх з намі ўжо няма, прыходзяць часам снамі і ўспамінамі. Мабыць, да паэтаў яны вяртаюцца вершамі, нібыта кампенсуючы незваротнасць страты. Тэма, зрэшты, небяспечная: кранальна-важнае для творцы не заўсёды адчуваецца чытачом, бо гранічная шчырасць часта падманліва ўспрымаецца як адзнака літаратурнай якасці. Аднак узважанае, а не пафасна-гучнае, разлічанае на эмацыйны водгук слова ў тых вершах В. Яраца, дзе асэнсоўваецца боль страты, выклікае павагу, уражвае сталай стрыманасцю:

Як адна ты ў хаце смерць
пачула —
невядома мне.
Запяклася кроў твая, матуля,
на руцэ на правай і на рукаве...


У сваіх «зямных эцюдах» аўтар сапраўды напоўніцу выкарыстоўваў палітру вясковых метафар. Карціна, створаная з такой натуралістычнай дакладнасцю, не ва ўсіх адгукнецца пазнаваннем. Для гэтага трэба памятаць вёску такой, якой памятае яе аўтар і якой ужо няма, якая засталася жыць толькі на старонках мастацкіх твораў. Таму многія вершы — сапраўды як эцюды са зніклай натуры.

...Вершы сталеюць разам з аўтарам: пачаткоўцы задаюць шмат пытанняў, сталыя паэты ведаюць, што адказаў насамрэч няма. І гэта не стома: колькі б за плячыма ні было дарог, паэт заўсёды ў пачатку шляху, заўсёды гатовы «ступіць на сцежку босымі нагамі — пачуць світальны халадок травы».

Жана Капуста

Бясконцая лесвіца ў неба…

Чарговы перадзімны нумар часопіса «Дзеяслоў» пачынаецца містычным трылерам з жыцця пражскіх големаў «Д'ябал запрэжаны ў плуг» вядомага крытыка і літаратара Сяргея Дубаўца.



А маль рэалістычны тэкст, атулены містычным туманам аўтарскай *дадуманасці*. Не, лепш, — містыфікацыя рэальнасці. Месца, час, героі — усё абсалютна пазначана і пазнавальна беларускамоўнаму чытачу: Прага з яе велічнай гісторыяй і архітэктурай, штаб-кватэра амерыканскага Радыё Салярыс, супрацоўнікі гэтай установы. Сам аўтар уводзіць сябе ў кантэкст твора, больш за тое, робіць сябе галоўным героем. Калі казаць філалагічна, то гэта маналог у дыялогу, дзе загалоўную ролю вядзе наратар. А перадусім — пошук чалавечага ў нацыянальным і нацыянальнага ў чалавечым.

«— Ты жывеш заўсёды для таго, з кім ты жывеш, каму перадаеш энергію і хто перадае табе, — працягваў разважаць Есіп. — У гэтым сэнс жыцця. Калі ты адзін, у тваім жыцці няма сэнсу. Пакуль ты толькі пачынаеш, толькі выйшаў на дарогу і перад табой шырокі свет, ты не заўважаеш гэтага…

— А калі змагаешся за адраджэнне… Не, не так. Русіфікацыя — гэта ж таксама перадача энергіі? — спытаў Імбрык.

— Не, гэта наадварот — як забойства, як выключыць ток. У такім выпадку мы перастаем быць народам і як народ ужо не перадаем энергію, страчваем сэнс існавання.

Безумоўна, гэта не завуаліраваная пад мастацкі тэкст адраджэнская справаздача старэйшага пакалення перад малодшым. Хутчэй, настаўленне і папярэджанне наступнікам, дзе вытлумачваюцца шараговая часовасць і пазнакі вечнага: з'яўленне, сыход, змена, эвалюцыя… Бо калі малодшы (Імбрык) пераймаецца знанасцю і вялікасцю, то старэйшы (Есіп) — значнасцю і трываласцю. Як бы між іншым у кантэксце фігуруюць і філасофскія развагі пра гармонію духоўнага і нацыянальнага як галоўнай сутнасці чалавечага жыцця.

«Ну, каб старэйшыя скідалі маладых. Знайдзі мне такі прыклад. І каб ён быў гэткі ж праканачўы, як гісторыя майстра Хірама, што кіраваў будоўляй сабора цара Саламона ў Ерусаліме. Хірама забілі, і што? Храм ягоны ў выніку так і не быў дабудаваны. А ведаеш, хто яго забіў? Ягоныя ж падначаленыя, моладзь, чаляднікі. Скінулі, што называецца, з карабля гісторыі. Знайшлося трое вырадкаў, якія хацелі гвалтам дамагчыся ад майстра таемнага слова, каб самім стаць майстрамі, хоць на тое яшчэ не мелі падставаў. Не дараслі. Страшны ўзрост. Ты ўжо не вучань, ты ўмееш абчэсваць дзікі камень. Ты чаляднік. Але каб быць майстрам, трэба ўмець мысліць усім будынкам, трымаць яго ў галаве. Гэта як *пісьменнік трымае ў галаве ўсю кнігу, якую піша, ці як рэдактар сайта трымае ў галаве ўвесь сайт».* У рэшце рэшт галоўныя героі дыялогу, дзе малодшы затоена-варожа ставіцца да старэйшага, падымаюцца на вядомы ў Празе Нусельскі мост самагубцаў. Гэта не метафара аўтара, гэта — сімвал пераадолення ўласнай духоўнай немачы ў самім сабе.

«Д'ябал запрэжаны ў плуг» Сяргея Дубаўца, як на маю думку, адзін з лепшых твораў сённяшняй беларускай літаратуры. Магчыма, каб ён быў у сёлетнім шорт-лісце прэміі Гедройца, то не ўзнікла б той незадаволенасці і псеўда-крытычнага вэрхалу вакол уганараваных і неўганараваных твораў і творцаў. Бо гэта якраз той тэкст, які змушае да ўдумнасці і развагі над нашым нацыянальным жыццём і чалавечым жыццём увогуле, схіляючы чытача да палемікі ў спрадвечным пошуку адказаў на пытанні, што вынікаюць з грамадскіх праяў чалавечага зямнога часу.

А вось пераважная большасць таго, што піша **Людміла Рублеўская,** можна сказаць, — па-за рэальнасцю. Вось і ў гэтай публікацыі — вершы «пра фобіі і маніі». Гэта метафарычная спроба разгадаць прыроду праміналага па яе пакінутых, ледзь заўважных блытаных слядах. Каму цікавая такая лірычна-лабараторная празорлівасць, той атрымае эстэтычнае задавальненне ад гэтых паэтычных тэкстаў.

Фэйсбучны раман, як пазначыў свой твор «Край ваўкалкаў» **Алесь Бычкоўскі,** раманам назваць можна толькі сыходзячы з сучасных дыскусій у сацыяльных электронных сетках. Хутчэй — проста нататкі, запісы, зацемкі, пазнакі часу, дзей, учынкаў і асобных людзей… Там, дзе аўтар успамінае пражытае і крэўнае, ёсць душэўнасць і літаратура, а там, дзе тэкст зводзіцца да факта альбо показкі, ён раздражнёна расслаблена чытача, як, да прыкладу, гэты фрагмент:

«Падслухаў размову двух, так бы мовіць, чытачоў-падпісчыкаў, працаўнікоў вытворчасці.

— У «Лясной газеце» папера крэпкая, мацней за туалетную, а вось у «Савецкай Беларусі» рвеца…

— Не кажы ты. А з «Бярэзінскай панарамы» добра самакруткі круціць. Трэба выпісаць.

А ў газетах тым часам спрачаюцца, чый матэрыял лепей?»

Ну няўжо і сёння самакруткі круцяць?! Даўно не палю, і ўсё ж сумняваюся…

Вершы чалавечай скрухі і хісткай надзеі… Так можна пазначыць паэтычную нізку шаноўнага **Міколы Гіля.**

Дзеці, унукі, праўнукі —
Мой ланцужок у прышласць;
Бацькі, дзяды і прадзеды —
Мой ланцужок у прошласць.
З прошласцю я паяднаны
Памяццю, духам і мовай;
З прышласцю ж рвуцца-парваны
Тры тыя самыя звёны —
Памяць і дух наш, і мова…

Традыцыйна-класічная проза **Леаніда Левановіча** пра чалавечую прагу да стваральнага жыцця, пра напоўненасць крэўнага роду любоўю і чалавечнасцю. Такі аўтарскі пасыл апавядання «Белая, белая яблыня».

Вельмі блізкае — па духу ды ідэі — апавяданне «За Крывою Грываю» **Міхася Зізюка,** маладзейшага за папярэдніка на трыццаць гадоў. Калі коратка, то падымаецца тая ж тэма: чалавек перад крыжам уласнага лёсу. Трапляючы ў трагічную сітуацыю, стары чалавек чапляецца за ўсё жывое, што скіроўвае яго выратавальны шлях па таемных слядах уласнай планіды. Усё, з кім дзяліўся сваім жыццём, працягвае яму сваю спагадлівую руку — і жывое, і мёртвае… Ну вось такое, як своеасаблівы адказ дубаўцоваму Імбрыку: *«Тады ён многа думаў, перажываў, і з перажытага вынес: беражы тое, што маеш. Няма нічога даражэйшага на свеце за сям'ю, дзяцей, радню, блізкіх сяброў, за той куточак, у якім нарадзіўся, вырас і жывеш — усё тое, што завецца радзімаю. Калі выходзіш на вуліцу і тваё сэрца цешыць старая таполя, што серабрыста-шапатлівай кронай узнеслася высока ў неба, калі ты радуешся вераб'ям, што цвыркаюць пад страхою твайго хлеўчука, лёгенька, з нейкай замілаванасцю дубцом падганяеш да хаты сваю карову, усміхаешся новаму дню, які пырскае ў вочы яркім ранішнім сонцам, ганарышся поспехамі сваіх дзяцей — ці можа быць штосьці даражэй за гэта?».* Пад такімі словамі можна і крытыку падпісацца.

Па-добраму здзіўляе, што нават вельмі сур'ёзныя людзі лічаць за лепшае лунаць у звершаваным паднеб'і, чым з усіх сіл трымацца за сярмяжную прозу жыцця… Адзін з такіх і літаратуразнаўца са Слоніма **Сяргей Чыгрын.** Вось якія строфы ён прысвячае вершам:

Вас мала хто сёння, паверце,
чытае,
І зборнікі-хаткі у шафах пыліцца.
Мы вечныя ісціны там не шукаем,
Мы ў вершах шчаслівымі хочам
застацца.
……………………………
О, вершы-ратункі, о,
вершы-адкрыцці,
Мы хочам з тугой назаўсёды
расстацца.
Бо там нашы лёсы, бо там нашы
жыцці…
Ды ўсе яны разам у шафах пыліцца.

Настальгічна-біяграфічныя, а таму ўзнёсла-шчырыя і пачуццёва-эмацыйныя аповеды бяльніцкага літаратара і барда **Юры Несцярэнкі** аб'яднаныя пад агульнай назвай «Шлях ад Вялікай ночы да Вялікага дня». У іх ёсць шчымлівая памяць і жывыя моманты штодзённасці, кроў і пот жыцця, і незваротнасць зямнога чалавечага канавання…

Не адразу заўважаеш, але спакваля разумееш, што традыцыйна-класічна стыль вершаў **Пятра Жаўняровіча** вельмі адмыслова (праўда, не скрозь) уфармаваны ў такі оруэлаўскі «наваяз» сучаснай беларускай філасофскай думкі. Працытую ўрывак з верша «Перадзімоўе»:

Скінуўшы апошні ліст руды,
Дуб самотны стыне на марозе.
Шэранню кранутыя груды
Нібы стыль аўталагічнай прозы.
Нудная нямая далячынь
Пасівела ад густых аблокаў.
Скрыпне дзесь паўмёртвую
латынь
Журавель у вёсцы за пратокай.
Быццам сімулякры з камінОЎ
Візурэнні дымныя ўзлятаюць.
Лапікі нязвезеных ільноў
Пашматала скрозь трава густая.
Поўніцца канцэптамі тугі
Позні дыскурс восеньскай
прыроды…

Нізка вершаў **Анатоля Івашчанкі** не губляецца ў паэтычным еўрапейскім кантэксце: вобраз сучаснага сацыяльна-актыўнага, індывідуальна-прагматычнага і пры ўсім тым духоўнага чалавека напярэдадні заўтрашніх пертурбацый жыцця… Неадназначнасць зместу і формы, думкі і пачуцця прываблiваюць сваёй шчырай арыгінальнасцю чытацкую ўвагу да творчай сутнасці аўтара.

я кармлю праз акно галубоў
дробна пашаткаваным батонам
я кармлю не таму што любоў
больш няма пакрыўшыць на каго
……………………………………
хтосьці скажа што чэл я някепскі
што старанна выконваю справу
можа хтосьці нат вершык
пахваліць
(я ахвотна паверу усім)

А вось у дэбютнай падборцы вершаў **Марыі Бадзей** шмат практычнай (філалагічнай) напрацоўкі для будучага творчага вопыту («І да поўні ў вадзе дапаўзае гадзюкай крыніца» ?! — занадта красвордны вобраз). Ад яе хаатычных, але схільных да гармоніі, строф на чытацкіх вуснах нярэдка застаецца помны новаайчынны смак слова:

Ружа вятроў жартуе і пахне
фугаю,
Скрыпкі восеньскіх студняў,
Брагі журба.
Яблыкаў у траве разгубленасць
Слухаю.
Дзён малацьба.

Вельмі насычаная замежным і архіўным зместам другая палова часопіса. Прапануюцца цудоўныя вершы **Арцюра Рэмбо** ў перакладах А. Хадановіча.

Ні думкі ў галаве і слоў шукаць
дарма,
Ды сэрца любіць свет і ўсім
на свеце сябар.
Шчаслівы, як цыган, пакрочу,
бо сама
Прырода ў ноч вядзе,
як прыгажуня ў табар.

І. Багдановіч (з уласнай прадмовай) прапануе пераклады апавяданняў **Габрыэлы Пузыні** пад агульнай назвай «Заклад на талерку вустрыцаў» (з польскай мовы). Друкуецца гутарка А. Данільчык з **Алінай Аляксеенка** пра родавы архіў, у тым ліку і літаратурны (публікуюцца вершы яе бабулі Галіны Гайлевіч). В. Жыбуль распавядае пра лёс рэпрэсаванага паэта **Сяргея Астрэйкі (**1912–1937) і рукапіс яго згубленай паэмы «Бенгалія» (фрагмент якой усё-ткі адшукаўся ў архівах ужо згаданай вышэй Г. Гайлевіч і друкуецца ў часопісе). Літаратуразнавец і крытык **Таццяна Алешка** выступае з грунтоўным артыкулам «пра вобразы Кітая ў сучаснай беларускай паэзіі». **Ігар Запрудскі,** вядомы крытык-палеміст, і на гэты раз змагаецца за сваё (за права Паўлюка Багрыма звацца нацыянальным паэтам): *«Мы жывём у постсекулярным свеце, насельнікам якога трэба абразы для пакланення. І цяпер, я думаю, што, відаць, лепш залічыць пытанне атрыбуцыі верша «Зайграй, зайграй, хлопчык малы…» да катэгорыі «вечных». Няхай «багрымаўскае» пытанне займае ганаровае месца побач з гамераўскім і шэкспіраўскім».* **Янка Запруднік,** вядомы эміграцкі гісторык і грамадскі дзеяч, у сваім артыкуле «Веры ў у неўміручасць Бацькаўшчыны» цёпла і душэўна ўспамінае свае сустрэчы з пісьменнікам Барысам Сачанкам. Філосаф **Валянцін Акудовіч** працягвае публікацыю «хронікі беларускага інтэлектуала», тэкст якой будзе адным са складнікаў яго новай кнігі. **Васіль Дранько-Майсюк** падае нам своеасаблівую характарыстыку постаці пісьменніка і грамадскага дзеяча Цішкі Гартнага (Зміцера Жылуновіча). Завяршае публікацыі гэтага нумара рэцэнзія **Леаніда Галубовіча** на зборнік вершаў Усевалада Сцебуракі «Сны дарог».

Словам, як вы зразумелі, у 96-м нумары «Дзеяслова» шмат вартага чытання. Не прапусціце.

ЛеГал

Будзьма з «Дзеясловам»!

Падпісацца на часопіс «Дзеяслоў» можна ў любым паштовым аддзяленні Беларусі і атрымліваць яго шэсць разоў на год.
Індэкс для індывідуальных падпісчыкаў — 74813,
Для ведамаснай падпіскі — 748132.
Будзьма разам!

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 11 (147) | 30 лістапада 2018 | № 44 (607) Новы час

ПРЭМІІ

Букераўская прэмія

Пісьменніца з Паўночнай Ірландыі Ганна Бернс стала лаўрэатам Букераўскай прэміі (Man Booker Prize) за свой раман «Milkman» («Малочнік»).

Як пераможца прэміі Бернс атрымала чэк на 50 тысячаў даляраў.

«Малочнік» напісаны ад асобы 18-гадовай дзяўчыны. Журы асобна адзначыла «незвычайную арыгінальнасць» рамана.

56-гадовая Ганна Бернс — першы аўтар з Паўночнай Ірландыі, які атрымаў Букера. «Малочнік» — яе чацвёрты раман.

У 2017 годзе Букераўскую прэмію атрымаў амерыканскі пісьменнік Джордж Сондэрс за раман «Лінкольн у Бардо».

«Альтэрнатыўны Нобель»

У Стакгольмскай грамадскай бібліятэцы было абвешчана імя пераможцы літаратурнай прэміі Новай Акадэміі Швецыі.

Сёлета Нобелеўская прэмія па літаратуры «ўзяла перапынак». Аднак група з больш чым ста шведскіх пісьменнікаў, акцёраў і журналістаў арганізавала Новую Акадэмію і ўзялася прысудзіць у гэты год прэмію, якую яны самі называюць «альтэрнатыўнай Нобелеўскай прэміяй па літаратуры».

Першая і апошняя ўладальніца гэтай узнагароды — 81-гадовая пісьменніца з Гвадэлупы Марыз Кондэ, у творах якой, па словах прэзідэнта журы Новай Акадэміі, незалежнага рэдактара і выдаўца Ан Полсан (Ann Pålsson), «спалучаюцца магія, мара, тэрор і любоў, выдумка і рэальнасць».

М. Кондэ лічыцца адной з найбольш выбітных пісьменніц Карыбскага рэгіёну. З'яўляецца аўтаркай каля дваццаці раманаў і ўладальніцай некалькіх прэстыжных літаратурных узнагарод. Была прафесарам Калумбійскага ўніверсітэта ў Нью-Ёрку, але цяпер жыве ў Гвадэлупе і ў Францыі. У сваіх творах яна сканцэнтравана на тым, як каланіялізм змяніў свет і як пацярпелыя ад яго спрабуюць вярнуць сваю спадчыну.

Бібліятэкарка Эліс Торберн (Alice Thorburn), прэзентуючы кнігі лаўрэаткі, адзначыла, што больш за ўсё прозе Кондэ падыходзіць слова «complexity» — яна складаная, у ёй мноства герояў, дэталяў і лакацый. Тым не менш, кнігі пісьменніцы захапляюць і чытаюцца лёгка.

Марыз Кондэ запісала відэазварот для тых, хто сабраўся на цырымоніі, у якім падзякавала журы не толькі ад сябе, але і ад нешматлікіх жыхароў Гвадэлупы, для якіх гэтая ўзнагарода вельмі важная.

Урачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцы пройдзе 9 снежня, пасля чаго Новая Акадэмія будзе распушчаная.

Ганкураўская прэмія

Французскі пісьменнік Нікаля Мацье стаў лаўрэатам Ганкураўскай прэміі (Prix Goncourt) — самай прэстыжнай літаратурнай прэміі ў франкамоўнымі свеце.




Узнагароду ён атрымаў за раман «Leurs enfants apres eux» («Дзеці пасля іх»). Абвяшчэнне імя пераможцы адбылося ў парыжскім рэстаране «Друан», дзе традыцыйна праходзіць урачысты абед 10-ці крытыкаў і пісьменнікаў Ганкураўскай акадэміі.

Пераможца прэміі, стоячы перад мікрафонамі ў рэстаране «Друан», сказаў: «Я правёў 18 месяцаў у адным пакоі, і я раптам стаў палохацца фараў аўтамабіля». І дадаў: «Гэтая ўзнагарода непазбежна зменіць маё жыццё. Я думаю пра майго сына Оскара. У такіх выпадках мы вяртаемся да асноў, я думаю пра сваю сям'ю, пра маіх бацькоў, пра горад, дзе я нарадзіўся, пра людзей, якіх я згадваў у кнізе…».

«Дзеці пасля іх» стаў другім раманам 40-гадовага літаратара. Назва паходзіць з біблейскай цытаты: «Ёсць іншыя, чыя памяць страчана, яны мёртвыя; <…> гэта як калі б яны ніколі не нараджаліся, а таксама іх дзеці пасля іх».

Журналістам аўтар кнігі паведаміў, што «Leurs enfants apres eux» — «гэта раман расчаравання», у ім паказана жыццё некалькіх падлеткаў, якія мараць вырвацца з будзённай рэчаіснасці, а таксама іх бацькоў. Нягледзячы на ўсе свае яркія мары, падлеткі асуджаныя існаваць у цесным жыцці сваіх бацькоў. Жаданні застаюцца нязздзейсненымі, нават прага жыць знікае…



Чытанне літаратуры падаўжае жыццё

Навукоўцамі былі праведзены даследаванні, у выніку якіх высветлілася, што чытанне кніг, у адрозненне ад перыядычных выданняў, істотна падаўжае чалавечае жыццё.

У даследаванні прымалі ўдзел 3635 чалавек ва ўзросце 50 гадоў і старэй, якія ў часе эксперыменту былі падзеленыя на 3 групы. У першую ўвайшлі тыя «падыспытныя», якія сумарна чыталі ад 3,5 гадзін у тыдзень і больш. Другую групу склалі тыя, хто чытаў кнігі менш 3-х гадзін у тыдзень, а ў трэцюю ўвайшлі тыя, хто наогул ігнараваў чытанне кніг.

За чытачамі назіралі на працягу 12 гадоў. І па выніках выявілася, што сярод аматараў пачытаць мастацкую літаратуру смяротнасць была на 6% ніжэй, чым сярод тых, хто не чытаў зусім. Таксама навукоўцы высветлілі, што чытачы кніг у сярэднім пражылі на 23 месяцы больш, чым «нечытэльныя» рэспандэнты.

Навукоўцы звярнулі ўвагу, што даўгалеццю спрыяла чытанне менавіта кніг, гэта значыць мастацкай літаратуры, а не перыёдыкі. У адрозненне ад газет, кнігі забяспечваюць эмацыйнае, «глыбокае апусканне» ў матэрыял, а такая практыка павялічвае канцэнтрацыю ўвагі, пашырае слоўнікавы запас, трэніруе розум, а таксама спрыяе развіццю ўмення суперажываць.

Цяпер перад навукоўцамі паўстала пытанне: ці валодае аналагічным эфектам для чалавека чытанне электронных кніг і праслухоўванне аўдыёкніг.

Архіў Джорджа Оруэла

Архіў англійскага пісьменніка і публіцыста, радыёвядучага і літаратурнага крытыка Эрыка Артура Блэра, якога ўвесь свет ведае пад творчым псеўданімам — Джордж Оруэл, — гэта асабістыя дзённікі, журналісцкія і пісьменніцкія нататкі, разнастайныя фразы і цытаты з кніг.

Нядаўна ён быў уключаны ў рэестр дакументальнай спадчыны ЮНЕСКА — спіс самых важных дакументаў свету.

Брытанскі аўтар шырока вядомы дзякуючы сваім аўтабіяграфічным аповесцям «Фунты ліха ў Парыжы і Лондане» і «Дні ў Бірме», а таксама сатырычнай аповесці «Жывёльны двор», але ў першую чаргу яго ведаюць як аўтара культавага рамана-антыўтопіі «1984». Менавіта з гэтага рамана ў сусветным лексіконе з'явіўся выраз «халодная вайна», а таксама сталі шырока вядомымі тэрміны «двухдумства», «думзлачынства», «навамоўе», «прававерныя». У рамане чытачы ўпершыню прачыталі злавесныя лозунгі "Вялікі брат глядзіць на цябе" і "Вайна — гэта мір. Няведанне — гэта сіла. Свабода — гэта рабства".

Створаная ў 1949 годзе кніга стала ідэйным працягам «Жывёльнага двара» — сатыры на рэвалюцыю 1917 года ў Расійскай імперыі. У «1984» Оруэл выявіў альтэрнатыўную будучыню таталітарнага іерархічнага грамадства, якое заснавана на фізічным і духоўным рабстве, працята усеагульным страхам, нянавісцю і даносамі.

У ЮНЕСКА адзначылі, што творчая спадчына Дж. Оруэла «моцна паўплывала на развіццё чалавечай думкі ва ўсім свеце, і гэты ўплыў актуальны і сёння». На думку сусветнай арганізацыі, ні адзін сур'ёзны агляд сучасных падзей на пачатку XXI стагоддзя не абыходзіцца без згадвання Оруэла ці яго ідэй. Сын Оруэла, пісьменнік Рычард Блэр, падкрэсліў, што рашэнне ЮНЕСКА — гэта дакладнае сведчанне каштоўнасці працы бацькі.

Год таму ў Лондане за 2 дні да выбараў і 68-й гадавіны выдання кнігі прайшлі публічныя чытанні рамана «1984», у якіх прынялі ўдзел больш за 50 вядомых культурных дзеячаў Вялікабрытаніі. Масавае чытанне ў Сенат-хаўс, першым хмарачосе ангельскай сталіцы і прататыпу Міністэрства Праўды, працягвалася з 9 раніцы да 10 вечара, яго транслявалі ўсе бібліятэкі і тэатры краіны.

Невядомыя аповеды Хэмінгуэя

Паводле паведамлення агенцтва «Associated Press», два раней не выдадзеныя аповеды вядомага амерыканскага пісьменніка, лаўрэата Пулітцэраўскай і Нобелеўскай прэмій Эрнэста Хэмінгуэя, якія ён напісаў у сярэдзіне 1950-х, будуць апублікаваныя ў наступным годзе.

Распарадчык літаратурнай спадчыны Хэмінгуэя Майкл Катакіс нядаўна паведаміў «Associated Press», што апавяданні «Манумент» і «Краіна індзейцаў і армія белых» увойдуць у спецыяльнае перавыданне класічнага рамана аўтара «Па кім звоніць звон». Гэтае ж выданне дапоўнілі яшчэ адным апавяданнем «Пакой у сад», які мала каму быў вядомы па-за кругам навуковай грамадскасці, перш чым амерыканскі часопіс «The Strand Magazine» апублікаваў яго сёлета.

М. Катакіс, чыя кніга «Эрнэст Хэмінгуэй: Артэфакты з жыцця» выйшла некалькі тыдняў назад, кіруе шматлікімі пасмяротнымі праектамі пісьменніка. Ён працаваў разам з сынам аўтара — Патрыкам — пры перавыданні ўспамінаў пісьменніка пра маладыя гады ў Парыжы.

Э. Хэмінгуэй напісаў пяць апавяданняў у 1956 годзе, разважаючы аб сваёй бытнасці ў якасці карэспандэнта і ўдзельніка Другой сусветнай вайны. Ён распавёў сваму выдаўцу Чарльзу Скрыбнеру-малодшаму, што гэтыя гісторыі павінны былі з'явіцца ў друку толькі пасля яго смерці, бо, на ягоную думку, яны былі «трохі шакуючыя» і апісвалі «нерэгулярныя войскі, баявыя дзеянні і людзей, якія забіваюць людзей».

Адно з тых апавяданняў, «Чорны асёл на скрыжаванні» («Black Ass at the Crossroads»), быў выдадзены шмат гадоў таму. Іншая гісторыя, «Дутая рэпутацыя», пакуль застаецца неапублікаванай.

У падрыхтоўцы старонкі выкарыстаны матэрыялы novostiliteratury.ru, Newsru.ua і «Associated Press».

Літаратурная Беларусь
Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА.
Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91. Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by